Москва
ЦК ВКП(б) Сельхозотдел комната 639
Іосифову
на 1934 г. Звезда—1

Камуністычная партыя (бальшавікоў)

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 90 (4923)
КРАСАВІК
25
СЕРАДА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Усім сакратарам райкомпартаў, начальнікам палітаддзелаў МТС і соўгасаў

Умовы надвор'я, наяўнасць зябліва, насення, падрыхтаванага веснавога ворыва робяць безумоўна магчымым для БССР сканчэнне сяўбы ранніх яравых (аўса, пшаніцы, ячменю) а таксама поўнае разгортванне пасеву ільну к 1 мая. ЦК лічыць справай гонару кожнага раёна прыйсці к 1 мая з поўным сканчэннем плана сяўбы ранніх яравых. Гэта абавязвае адстаючыя раёны, як Талачын, Дуброўна, Сураж і інш., неадкладна падцягнуцца па тэмпах да перадавых, гэта абавязвае перадавыя раёны набраць яшчэ большыя тэмпы. Ні аднаго раёна, калгаса, соўгаса, аднаасобніка БССР, не скончыўшага к 1 мая сяўбы ранніх яравых. Неадкладна арганізуйце калгаснікаў, аднаасобнікаў, рабочых соўгасаў на выкананне пастаўленай задачы.

24 красавіка 1934 г.

ГІКАЛО

ТАЛАЧЫНСКІ І БЯГОМЛЬСКІ РАЁНЫ ЗРЫВАЮЦЬ ТЭМПЫ І ЯКАСЦЬ СЯЎБЫ

Поўнае і добраякаснае завяршэнне сяўбы зернавых і ільну—найлепшы падарунак к 1 мая

Ліквідаваць адставанне аднаасобнікаў у сяўбе

З першых-жа дзён веснавой сяўбы ў БССР нагляддаецца рэзкае адставанне аднаасобнага сектара. У той час як калгасы засеялі на 20 красавіка 21,2 проц. яравых, аднаасобнікі засеялі толькі 10,2 проц.

Адставанне аднаасобнага сектара значна зніжае выкананне плана па рэспубліцы, яно з'яўляецца адной з галоўных прычын таго, што выкананне плана сяўбы аўса ў тэрмін, устаноўлены партыяй і урадам, сарвана.

Гэта яшчэ раз пацвярджае правільнасць указання ЦК КП(б)Б аб тым, што «кіраўніцтва раёнаў працягвае недаацэньваць значэнне і ролю аднаасобнага сектара ў бягучай сяўбе, асабліва ў раёнах з нізкім процантам калектывізацыі».

Многія раённыя арганізацыі зусім забываюць на тое, што ў БССР аднаасобнікі займаюць у яравым пасеўным кліне каля 40 проц. і што поўная перамога ў сяўбе залежыць ад таго, наколькі своечасова і добра засее аднаасобнік.

У **МАЗЫРСКІМ** раёне, напрыклад, «левацкія» па сутнасці кулацкія, разважанні ў адносінах да працоўных аднаасобнікаў прывялі да таго, што значная колькасць аднаасобнікаў і зараз не ведае дзе сеяць. У выніку у той час, калі калгасы раёна засеялі 39,3 проц. яравых, аднаасобнікі засеялі ўсяго 17,3 проц.

Інакш, як простай дапамогай класава-варожым элементам у іх падрыўной дзейнасці, нельга расцэньваць адносіны да аднаасобнікаў у **ЕЛЬСКІМ** раёне. Сярод паўднёвых раёнаў Ельскі з'яўляецца самым адстаючым толькі таму, што аднаасобны сектар, які займае ў пасеўным плане раёна 70 проц., засеяў толькі 18,8 проц. яравых. Цэлымі вёскамі аднаасобнікі не выходзяць сеяць проста таму, што яны не ведаюць дзе ім адведзена зямля. Такое становішча і ў **ЛОЕЎСКІМ, ЧЭРЫКАЎСКІМ, ГЛУСКІМ, СТАРАДАРОЖСКІМ** і радзе іншых раёнаў БССР.

ЦК КП(б)Б ў свой час самым рашучым чынам папярэдзіў партыйнае і савецкае кіраўніцтва **МАГІЛЕЎСКАГА** раёна супроць недаацэнкі ролі і значэння аднаасобніка. Аднак, указанні ЦК і да сённяшняга дня не ўлічаны ў рабоце магілеўскай партыйнай арганізацыі. Аднаасобны сектар у Магілеўскім раёне засеяў толькі 6,6 проц., у той час як калгасы засеялі 22 проц.

Найбольш яркім прыкладам антыпартыйных адносін да працоўных аднаасобнікаў можа паслужыць Мышкаўскі сельсовет **БАБРУЙСКАГА** раёна. У гэтым сельсовеце «левакі» дайшлі да таго, што зусім пазбавілі аднаасобнікаў зямлі, нават прысядзібнай.

Кіраўнікі раду раёнаў замест разгортвання масавай работы і арганізацыі сяўбы ў аднаасобным сектары, замест прыцягнення да адказнасці людзей, якія ігнаруюць аднаасобнікаў, патураюць кулацкім разважанням.

Першае і асноўнае мерапрыемства, якое забяспечыць пералом у ходзе сяўбы па аднаасобнаму сектару, з'яўляецца разгортванне масавай растлумачальнай работы сярод працоўных аднаасобнікаў, мабілізацыя іх актыўнасці на барацьбу з кулацкім сабатажам сяўбы.

Усякае зацягванне адводу зямлі кожнаму працоўнаму аднаасобніку трэба расцэньваць як садзейнасць кулацкім элементам у зрыве сяўбы.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на арганізацыю ўзаемадапамогі аднаасобных гаспадарак і дапамогі бесконным гаспадаркам. Справай гонару кожнага перадавога калгаса з'яўляецца таксама аказанне дапамогі працоўным аднаасобнікам,—заўтрашнім калгаснікам,—у выкананні планаў сяўбы.

Задача раённых арганізацый, у першую чаргу зямельных органаў, забяспечыць не толькі колькаснае выкананне плана аднаасобнікамі, але і поўнае захаванне імі аграмінімума пры сяўбе. У кожнай дзесяцідворцы, таксама як і ў калгасах, павінны быць арганізаваны інспекцыі якасці з лепшых працоўных аднаасобнікаў.

На сельсоветы ўскладаецца выключная адказнасць за арганізацыю сяўбы ў аднаасобным сектары. Ад таго, наколькі сельсоветы здолеюць арганізаваць дзесяцідворкі і забяспечыць належны падбор і кіраўніцтва ўпаўнаважанымі дзесяцідворак, будзе залежаць высокаякаснае выкананне плана сяўбы кожнай аднаасобнай гаспадаркай.

Вопыт дзесяцідворкі **СЕЎРУКА МІХАСЯ** з вёскі **Сорагі** (Случчына), матэрыял аб якой мы пісалі ўчора, паказвае, што толькі правільным кіраўніцтвам дзесяцідворкай, арганізацыяй масавай растлумачальнай работы, канкрэтнай ўзаемадапамогай можна дабіцца таго, што аднаасобнікі і па тэмпах, і па якасці сяўбы не будуць адставаць ад калгасаў.

Ва ўмовах БССР аднаасобны сектар у значнай меры рашае поспех сяўбы. **Неадкладная ліквідацыя адставання аднаасобнікаў у сяўбе з'яўляецца першачарговай баявой задачай усіх партыйных і совецкіх арганізацый.**

У Заслаўлі ігнаруюць якасць сяўбы

У **Заслаўскім** раёне забыта дырэктыва партыі і ўрада аб тым, што зараз важнейшай задачай сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўляецца барацьба за якасць, барацьба за высокі ўраджай. Калгаснікі Заслаўскага раёна не мабілізаваны ў дастатковай ступені на выкананне гэтай задачы. Многія паказальнікі па раду калгасаў гавораць аб адваротным, аб тым, што сяўба праводзіцца з парушэннем самых элементарных правіл агратэхнікі. Вось прыклады.

У калгасе **імя XIII гадавіны Окцябра пасеў аўса на плошчы 20 гектараў праведзен па аднаму ворыву**, таксама ў калгасе імя Фрунзе засеяна ў аднавор 15 гектараў, ды наогул усе калгасы раёна, маючы нязначны процант узаранай зямлі пад зяб, праводзяць сяўбу па аднавору. Якасць-жа зябі нікуды няварта. Асенняе ворыва праводзілі позна, перад самымі маразамі, таму дзярніна не перапрэла і зараз пры ворыве вывёртваецца на паверхню глебы, узнімаючы з сабой і захаваўшаеся насенне пустазелля.

Сяўба зернавых праводзіцца ва многіх калгасах уручную нават тады, калі калгасы (напрыклад, калгас «XIII гадавіна Окцябра»), забяспечаны радковымі сяўркамі. Наогул у раёне радковая сяўба не ў пашане; рэдка сустрэнеш на палях радковую сяўбу як у калгасах неабслугоўваемых, так і абслугоўваемых МТС. З рук вон дрэнна абстаіць справа з ачысткай і пратручваннем насеннага матэрыяла.

Пратручванне насення праводзіцца без належнага захавання правіл, з-за чаго траціцца эфектыўнасць пратручвання і няма гарантыі ад частковага псавання пасеўнага матэрыяла, прычым пратручваецца толькі частка насення. У калгасе імя Фрунзе з 200 цэнтнераў насенфонду зернавых запланавана пратруціць толькі 79 цэнтнераў, прычым гэты план ёсць у МТС, якая лічыць, відавочна, нармальным толькі частковае пратручванне. Некаторыя-ж калгасы, як напрыклад «Чырвоны Захад», зусім ігнаруюць пратручванне. Адпушчаны фармалін гэты калгас не паклапаціўся нават атрымаць у МТС і сее не пратручаным насеннем.

Не менш агідна стаіць справа і з унясеннем мінеральных угнаенняў. Угнаенні па сутнасці справы не высяваюцца, а проста раскідваюцца лапатамі. Пералічаныя адмоўныя бакі (а гэта толькі частка іх) гавораць аб тым, што райком і палітаддзел МТС павінны неадкладна ўзмацніць кіраўніцтва сяўбой, наладзіць кантроль за якасцю і мабілізаваць калгаснікаў на барацьбу за высокую ўраджайнасць калгасных палёў. Не трэба забываць, што агратэхнічная палітыка партыі — адна з састаўных частак агульнай палітыкі партыі ў вёсцы.

МІКУНОЎ

старшыня Менскай міжраённай камісіі па вызначэнню ўраджайнасці.

Паявіліся дружныя ўсходы ранніх яравых

Брыгадзіры Пашкоўскі, Лебедзеў і Вудкоў—кандыдаты на ўсебеларускую чырвоную дошку

РАГАЧОЎ, 22. (Па тэлеф. ад брыгады «Звязды»).

На 20 красавіка калгасы зоны МТС засеялі 3.376 гектараў—41,5 проц. яравых культур. Аўса засеяна 1.575 гектараў—84,2 проц. План ранніх яравых выканан на 80,5 проц. Скончылі сяўбу аўса 39 калгасаў з агульнага ліку 75. Поўнасцю закончылі сяўбу ранніх зернавых 34 калгасы. Характэрна адзначыць, што самыя адстаючыя калгасы ў мінулым годзе — «Чырвоны партызан», «Чырвоны прамень», «Чырвоны Лінькаў» —сёлета сяўбу ранніх зернавых закончылі першымі. Тут сказалася арганізатарская і палітычна-масавая работа палітаддзела. З самага пачатку падрыхтоўкі і правядзення сяўбы палітаддзел узяў гэтыя калгасы пад свой непасрэдны нагляд, разгортваючы паміж брыгадамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Зараз палітаддзел пераключыў сваю ўвагу на арганізацыю дапамогі тром адстаючым калгасам—«Ніва Окцябра», імя Варашылава, «Праца і абарона».

Калгасы, скончыўшыя сяўбу зернавых, пераключыліся на сяўбу ільну і бульбы пад лозунгам сканчэння сяўбы гэтых культур да пролетарскага свята 1 мая. Палітаддзел і райком партыі арганізавалі першамайскі паход за заваяванне калгасамі права ўдзелу ў першамайскіх святкаваннях. Калгасы, якія скончаць сяўбу бульбы і ільну да 1 мая, будуць пасылаць лепшых калгаснікаў-ударнікаў у цэнтр раёна для ўдзелу ў першамайскіх святкаваннях.

На палях некаторых калгасаў (**«Чырвоны партызан», «Чырвоны маяк», «Чырвоны прамень», «Шлях селяніна»** і інш.) **паявіліся дружныя ўсходы звышранніх і ранніх яравых, ячменю, пшаніцы, аўса і ільну.**

У пераважнай большасці калгасаў сяўба ячменю, пшаніцы і аўса праведзена радковай сяўркай. Сяўба ўручную праводзілася толькі там, дзе сяўрку не было як скарыстаць па прычыне грузкасці, і на лядах. Якасць падрыхтоўкі глебы і непасрэдна сяўбы ў асноўным у калгасах добрая. Былі выпадкі, калі ў двух калгасах—«Красіна» і «Чырвоны Пуцілавец» —пачалі сяўбу аўса ўручную на ўчастках, дзе свабодна можна было прымяніць радковую сяўрку. Палітаддзел хутка рэагаваў на гэтыя факты, завастрыўшы на іх увагу ўсіх калгасаў. Як правіла, палявыя работы амаль ва ўсіх брыгадах правяраюцца і прымаюцца не толькі брыгадзірамі, але і грамадскімі інспектарамі якасці.

Ва ўсебеларускім конкурсе паляводчых і трактарных брыгад прымаюць удзел 50 паляводчых і 6 трактарных брыгад. Кандыдатам на ўсебеларускую чырвоную дошку з'яўляюцца брыгады тав. **Пашкоўскага** з калгаса **«Чырвоны партызан»**, тав. **Лебедзева** з калгаса «Чырвоны прамень», і трактарная брыгада тав. **Дудкова.**

Брыгада «Звязды»: ВЯРХОЎСКІ, ФРАЛОЎ.

ПЕРШЫМ У РАЁНЕ

Соцыялістычнае спаборніцтва на полі

БАБРУЙСК. (Па тэлеф. ад кар. «Звязды»).

Калгас імя 518, Падарэскага сельсовета, за тры дні засеяў усе зернавыя культуры.

15-га красавіка ў калгас прыехаў інструктар райкампарта тав. **Воранаў.** Праз поўгадзіны ў канцылярыі калгаса сабраўся ўвесь калгасны актыў. Першымі прышлі комуністы — парторг калгаса **Навіцкі,** старшыня **Струнеўскі і Кашкоў.** Інструктар зачытаў актыву тэлеграму, у якой сакратар ЦК КП(б)Б тав. **ГІКАЛО** патрабаваў неадкладнага развароту сяўбы. Тав. Воранаў растлумачыў сутнасць гэтага патрабавання.

Супярэчнасцей не было. Гаварылі аб другім — як пры недахваце цягавай і рабочай сілы забяспечыць выкананне планаў да 20 красавіка. Парашылі выйсці брыгадамі ў поле ўсім без разбору «чыноў», комуністам паказаць прыклад у рабоце.

16 красавіка — дзень канцэнтрацыі і расстаноўкі сіл для наступлення. Насыпалі ў мяшкі насенне і павезлі на ўчасткі. Інспектар па якасці **Лазаковіч** інструктаваў сейбітаў. Ён набраў каробку насення і ўласнаручна паказаў, як трэба сеяць, каб насенне клалася роўным пластом, каб у адным месцы не было густа, а ў другім пуста.

Баранавальшчыкі цэлы дзень рыхтавалі глебу пад пасеў яравых.

На чале першага звяна сейбітаў стаў старшыня калгаса, член КП(б)Б т. Струнеўскі, другога — парторг т. Навіцкі. Звенні падпісалі дагавор соцыялістычнага спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае выкананне пасеву..

Тав. Струнеўскі лепш падрыхтаваў сваё звяно і ўжо 16-га пасля абеда прыступіў да сяўбы. Навіцкі не захацеў адставаць і 17 красавіка паставіў на сяўбу не трох, а чатырох сейбітаў і падвечар абодва звенні далі аднолькавыя рэзультаты. Кожнае звяно засеяла 14 гектараў, або па 3 з лішнім гектары на кожнага сейбіта. Нормы былі перавыкананы.

У гэты дзень быў засеян увесь авёс у колькасці 20 гектараў з перавыкананнем плана на 1 гектар.

18 красавіка засеяна пшаніца і насенны лубін, а 19-га — ячмень. Ячменю засеялі на 2 гектары больш, чым меркавалася па плану.

Сёння будзе засеян увесь гарох — тры гектары і палова ільну. 21 красавіка ўсе брыгады пераключаюцца на пасадку бульбы, з тым, каб 1 мая сустрэць поўным завяршэннем пасеўнай.

Дзякуючы ўпартай і ўмелай рабоце калгасных комуністаў, калгас імя 518 у мінулым годзе лепш за другія калгасы правёў пасеўную, атрымаў самы вялікі ў раёне ўраджай (ураджайнасць аўса даходзіла да 20 цэнтнераў з гектара), самы важкі працадзень — 29,5 кіло (3,5 зернавых, 22 кіло бульбы і 4 кіло фуражу).

Сёлета пасеўная кампанія праходзіць яшчэ больш арганізавана. Усё поле добра апрацавана і ўгноена. З гарода на поле вывезена 800 вазоў гною і сваіх 450. Увесь пасеў зроблен або па леташняй угноенай зямлі (бульбянішчы), або па сёлетняму свежаму ўгнаенню.

Калгаснікі калгаса імя 518 зусім абгрунтавана лічаць, што сёлета атрымаюць на працадзень мінімум 2 пуды.

П. Чыкун.

Перадавікі соцыялістычнага спаборніцтва

ДАМАНАВІЧЫ. 23 КРАСАВІКА КАЛГАС **«ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА»** (МАЗЫРШЧЫНА) СКОНЧЫЎ СЯЎБУ УСІХ КУЛЬТУР. ЗАСЕЯНА 22 ГЕКТАРЫ АЎСА, 9 ГЕКТАРАЎ ЯЧМЕНЮ, 13 ГЕКТАРАЎ ПШАНІЦЫ, **5 ГЕКТАРАЎ ГАРОХУ, 3 ГЕКТАРЫ** ВІКІ, 4 ГЕКТАРЫ ЛУБІНУ, 42 ГЕКТАРЫ БУЛЬБЫ І 7 ГЕКТАРАЎ КАНАПЕЛЬ. ПАСЕЎ ПРЫЗНАН ДОБРА ЯКАСНЫМ. ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў СПАБОРНІЦТВЕ ЗАНЯЛА ТРЭЦЯЯ БРЫГАДА — **САЗОНАВА ПЯТРА.** ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ: ДРОЗД НІКАЛАЙ, КАРШАК ВЛАДЗІМІР, САЗОНАЎ ВАСІЛЬ, ШЭСТУН ФРОСЯ, ШЭСТУХОВА МАРФА.

ПАЛІТАДДЗЕЛ ДАМАНАВІЦКАЙ МТС.

БАРЫСАЎ. КАЛГАС ІМЯ 1 МАЯ, ЛЕВЕНЬСКАГА СЕЛЬСОВЕТА, 22-га КРАСАВІКА, НА МЕСЯЦ РАНЕЙ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ, ПЕРШЫМ У РАЁНЕ ЗАКОНЧЫЎ ВЕСНАВУЮ СЯЎБУ. ЗАСЕЯНА 9 ГЕКТАРАЎ АЎСА, 6 ПШАНІЦЫ, 7 ГЕКТАРАЎ ЯЧМЕНЮ, 13 БУЛЬБЫ І 2 ГЕКТАРЫ ГАРОХУ. СЯЎБА ПРАВЕДЗЕНА Ў ДВА ВОРЫВЫ. НА ЎГНОЕНАЙ ГЛЕБЕ. У ЧАСЕ ВОРЫВА І СЯЎБЫ ПЕРШАЙ ПА ТЭМПАХ І ЯКАСЦІ РАБОТ ІШЛА ПАЛЯВОДЧАЯ БРЫГАДА **СЯРМЯЖКІ В.**

КАЛГАС ПЕРАКЛЮЧЫЎСЯ НА ДАПАМОГУ СУСЕДНЯМУ АДСТАЮЧАМУ КАЛГАСУ «ШЛЯХ ЛЕНІНА».

ГУРЭВІЧ.

АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ НАРКАМСОЎГАСАЎ САЮЗА ССР І ЯГО МЯСЦОВЫХ ОРГАНАЎ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў Саюза ССР

У мэтах ліквідацыі арганізацыйных недахопаў у рабоце і пабудове апарата Наркамсоўгасаў СССР і яго мясцовых органаў, палепшэння іх работы і ўмацавання адзінаначалля ЦВК і СНК Саюза ССР пастанаўляюць рэарганізаваць сістэму Наркамата Соўгасаў СССР на наступных падставах.

I.

ЦЭНТРАЛЬНЫ АПАРАТ НАРКАМАТА СОЎГАСАЎ

1. Ліквідаваць у Народным Камісарыяце Зернавых і Жывёлагадоўчых Соўгасаў наступныя кіраўніцтвы і сектары: а) Галоўнае кіраўніцтва эксплаатацыі і рамонту; б) Кіраўніцтва арганізацыі тэрыторыі); в) Кіраўніцтва ўчоту і размеркавання кадраў; г) Кіраўніцтва працы і быту; д) Кіраўніцтва ўчоту і статыстыкі; е) Апалавае кіраўніцтва; ж) Фінансавае кіраўніцтва; з) Кіраўніцтва бухгалтарскага ўчоту; і) Кіраўніцтва рабочага снабжэння; к) Кіраўніцтва капітальнага будаўніцтва; л) Навукова-тэхнічнае кіраўніцтва; м) Ветэрынарнае кіраўніцтва; н) Племяннное кіраўніцтва; о) Сектар кантролю і збыту; п) Сектар насеннаводства; р) Сектар пажарнай аховы; с) Прававы сектар; т) Сектар праверкі выканання; у) Зернабуд.

2. Зацвердзіць наступную структуру цэнтральнага апарата Наркамсоўгасаў:

а) ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ЗЕРНАВЫХ СОЎГАСАЎ, з ускладаннем на яго ўсіх функцый па кіраванню зернавымі соўгасамі Наркамсоўгасаў.

б) ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА МАЛОЧНА-МЯСНЫХ СОЎГАСАЎ, з ускладаннем на яго ўсіх функцый па кіраўніцтву малочнымі і мяснымі соўгасамі Наркамсоўгасаў.

в) ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА СВІНАВОДЧЫХ СОЎГАСАЎ, з ускладаннем на яго ўсіх функцый па кіраўніцтву свінаводчымі соўгасамі Наркамсоўгасаў.

г) ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА АЎЦАГАДОЎЧЫХ СОЎГАСАЎ, з ускладаннем на яго ўсіх функцый па кіраўніцтву аўцагадоўчымі соўгасамі Наркамсоўгасаў.

д) ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА НАВУЧАЛЬНЫМІ ЎСТАНОВАМІ, якому падначаліць вузы, тэхнікумы і школы па асобаму спісу Наркамсоўгасаў.

е) ПАЛІТЫЧНАЕ КІРАЎНІЦТВА.

3. У складзе Галоўнага кіраўніцтва зернасоўгасаў ствараюцца наступныя аддзелы:
а) агратэхнічны і севазваротаў.
б) машынна-тэхнічны,
в) насенны,
г) жывёлагадоўчы,
д) рабочага снабжэння,
е) фінансавы з бухгалтэрыяй;
СЕКТАРЫ: а) планавы, б) будаўнічы, в) кадраў, г) па навукова-даследчых установах.

У складзе галоўных жывёлагадоўчых кіраўніцтваў ствараюцца наступныя аддзелы:
а) зоатэхнічны,
б) ветэрынарны,
в) машынна-тэхнічны,
г) агратэхнічны,
д) племянны,
е) фінансавы з бухгалтэрыяй;
СЕКТАРЫ: а) планавы, б) будаўнічы, в) кадраў, г) па навукова-тэхнічных установах.

Для палепшэння сувязі галоўных кіраўніцтваў з трэстамі і соўгасамі і забеспячэння кіраўніцтва работай трэстаў і соўгасаў у складзе галоўнага кіраўніцтва зернасоўгасаў і галоўных кіраўніцтваў жывёлагадоўчых соўгасаў выдзяляюцца памочнікі начальнікаў кіраўніцтваў з інспектурай па наступных групах раёнаў:

а) Галоўнае кіраўніцтва зернасоўгасаў —

1-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі УССР, Крыма, Паўночна-Каўказскага і Азова-Чарнаморскага краёў.

2-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі Сталінградскага, Саратаўскага і Сярэдня-Волжскага краёў, Башкірскай АССР, ЦЧВ.

3-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі ДУК, Усходня-Сібірскага і Заходня-Сібірскага краёў, Казакстана Чэлябінскай, вобласці.

б) Галоўныя кіраўніцтвы малочна-мясных і аўцагадоўчых соўгасаў.

1-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі УССР, Крыма, Паўночна-Каўказскага і Азова-Чорнаморскага, Сталінградскага, Саратаўскага краёў і ЦЧВ.

2-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі Заходня-Сібірскага, Усходня-Сібірскага, Паўночнага і Сярэдне-Волжскага краёў, Свярдлоўскай вобласці, Башкірскай і Татарскай АССР.

3-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі Чэлябінскай вобласці, Казакстана і Кіргізіі.

в) Галоўнае кіраўніцтва свінагадоўчых соўгасаў —

1-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі УССР, Паўночна-Каўказскага і Азова-Чарнаморскага краёў.

2-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі Саратаўскага і Сярэдня-Волжскага краёў, ЦЧВ, Башкірскай і Татарскай АССР.

3-я ГРУПА трэстаў, размешчаных на тэрыторыі Ўсходне-Сібірскага і Заходня-Сібірскага краёў, Чэлябінскай вобласці і Казакстана.

4. Арганізаваць наступныя цэнтральныя аддзелы Наркамсоўгасаў СССР:
а) Планава-фінансавы,
б) Учоту і статыстыкі,
в) Спецаддзел,
г) Адміністратыўна-гаспадарчы,
д) Сакратарыят Наркамата.

5. Стварыць пры Наркоме:
а) Сектар па ўчоту і падбору кадраў,
б) Цэнтральны арбітраж,
в) Навукова-Тэхнічны Совет,
г) Група інспектароў па праверцы выканання.

6. Рэарганізаваць «Совхозснаб» у кантору «Совхозснабжение», пакінуўшы за ёю функцыі па снабжэнню соўгасаў машынамі, прыладамі і мінеральнымі ўгнаеннямі па наменклатуры, зацвярджаемай СНК СССР.

II.

САЮЗНЫЯ ТРЭСТЫ ЗЕРНАВЫХ І ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ СОЎГАСАЎ

1. У саюзных зернавых трэстах арганізаваць наступныя аддзелы:
а) Агра-паляводчы,
б) Машынна-тэхнічны,
в) Насенны,
г) Жывёлагадоўчы,
д) Планавы,
е) Рабочага снабжэння,
ж) Фінансавы з бухгалтэрыяй,
з) Гаспадарча-разрахунковая кантора са складамі і магазінамі па продажу соўгасам інвентара і матэрыялаў,
і) Будаўнічая кантора,
к) Адміністратыўна - гаспадарчы сектар.

2. У саюзных жывёлагадоўчых трэстах арганізаваць наступныя аддзелы:
а) Зоатэхнічны,
б) Ветэрынарны,
в) Племянны,
г) Машынна-тэхнічны,
д) Агра-паляводчы,
е) Планавы,
ж) Фінансавы з бухгалтэрыяй,
з) Будаўнічы,
і) Гаспадарча-разрахунковая кантора са складамі і магазінамі па продажу соўгасам інвентара і матэрыялаў,
к) Адміністратыўна-гаспадарчы сектар.

3. На чале трэста стаіць дырэктар трэста з двума намеснікамі, з іх адзін—намеснік па палітычнай частцы.

III.

СОЎГАСЫ

1. На чале соўгасаў стаіць дырэктар, які назначаецца і знімаецца Народным Камісарам.

Дырэктар соўгаса мае аднаго намесніка (акрамя намесніка па палітычнай частцы) і аднаго памочніка па рабочаму снабжэнню.

2. Зацвердзіць наступную тыпавую структуру для зернасоўгасаў:
а) Дырэктар соўгаса,
б) Палітаддзел соўгаса,
в) Кіраўнік аддзялення (па ліку аддзяленняў) з намеснікам па паліт частцы.
г) Старшы аграном соўгаса і малодшыя агрономы па ліку аддзяленняў.
д) Загадчык трактарнага парка, які непасрэдна адказвае за правільную эксплаатацыю і захаванне трактароў і машын,
е) Механікі па ліку аддзяленняў,
ж) Загадчык нафтабазай,
з) ОРС,
і) Бухгалтэрыя.

У складзе соўгаса знаходзяцца падначальваюцца непасрэдна дырэктару зернасоўгаса аўтакалонны, дарожны атрад і рамонтная майстэрня.

3. Зацвердзіць наступную тыпавую структуру жывёлагадоўчых соўгасаў:
а) Дырэктар соўгаса,
б) Палітаддзел соўгаса,
в) Кіраўнік фермы па ліку ферм,
г) Старшы зоатэхнік і малодшы зоатэхнікі па ліку ферм,
д) Ветэрынарны доктар і ветэрынарныя фельчары па ліку ферм,
е) Зоатэхнік па племяннай рабоце,
ж) Аграном соўгаса,
з) Механік,
і) Загадчык нафтагаспадаркай,
к) Бухгалтэрыя.

IV.

УПАЎНАВАЖАНЫЯ НАРКАМАТА СОЎГАСАЎ

1. Наркамсоўгасаў мае пры Со[...]наркомах Саюзных Рэспублік сва[...] упаўнаважаных.

2. Ліквідаваць існуючыя зараз кі[...]раўніцтвы ўпаўнаважаных Наркамата Соўгасаў у краях, абласцях і а[ў]таномных рэспубліках.

Прадаставіць СНК аўтаномных рэспублік, краявым і абласным выканкомам права кантролю над дзейнасцю соўгасных трэстаў Наркамсоўгасаў.

Абавязаць Народны Камісарыят Зернавых і Жывёлагадоўчых Соўгасаў СССР правесці перабудову органаў кіраўніцтва соўгасамі на аснове гэтай пастановы не пазней 1 чэрвеня 1934 года.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Сарза СС[...]
М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар ЦВК Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль, 22 красавіка 1934 г.

Байцы аўстрыйскіх барыкад у СССР

Учора праз Менск праехалі ў Маскву 306 шуцбундаўцаў-удзельнікаў лютаўскіх баёў, якія вырваліся з крывавых лап аўстрыйскага фашызма

Учора ў СССР прыбыла вялікая група аўстрыйскіх пролетарыяў — удзельнікаў лютаўскіх баёў у Вене, Лінцы, Фларыдсдорфе.

Для сустрэчы шуцбундаўцаў у Негарэлае прыехала з Масквы дэлегацыя прадстаўнікоў Выканкома Комінтэрна, Выканкома Профінтэрна, ЦК ВКП(б), ВЦСПС, Выканкома Мопра, ЦК Мопра СССР. З Менска выехалі дэлегацыі ад ЦСПСБ, ЦК Мопра БССР, заводаў імя Варашылава, імя Молатава, «Большэвік» і «Окцябр».

У 6 гадзін вечара на станцыі акрамя дэлегацыі сабраліся рабочыя ст. Негарэлае і бліжэйшага соўгаса.

З боку Польшчы падыходзіць экспрэс. Шуцбундаўцы разгортваюць чырвоныя сцягі.

Музыка. Магутнае «ЎРА», «РОТ ФРОНТ». Прыбыўшых байцоў вітаюць прадстаўнікі і ВЦСПС і ЦК аўстрыйскай компартыі.

Ад імя шуцбундаўцаў выступае камендант эшалона т. РОШАР, кіраўнік гераічных рабочых Фларыдсдорфа, якія з асаблівай жорсткасцю змагаліся супраць фашыстаў.

Ён заяўляе:

— Мы не чакалі такой гарачай брацкай сустрэчы. Прылажым усе сілы к таму, каб апраўдаць гэту сустрэчу і давер'е пролетарыяў Совецкага Саюза.

**

Вестка аб прыбыцці атрада гераічных рабочых Аўстрыі быстра абляцела фабрыкі і заводы Менска. К вакзалу пацягнуліся калоны рабочых з аркестрамі і чырвонымі сцягамі. Тысячы менскіх пролетарыяў выстраіліся на пероне, каб вітаць удзельнікаў венскіх барыкад.

З першым экспрэсам з Негарэлага прыбылі 105 шуцбундаўцаў. З імправізаванай трыбуны іх вітаў ад імя ЦК КП(б)Б і ЦК Мопра БССР тав. ДОМБАЛЬ.

Праз дзве гадзіны прыбыў другі спецыяльны поезд з 200 шуцбундаўцамі. Пасля т. т. ДОМБАЛЯ і РОШАРА слова бярэ т. ФІШАР—былы рэдактар ЦО соцыял-дэмакратычнай партыі Аўстрыі «Арбейтэр цэйтунг», лідэр левай апазіцыі, перайшоўшай у компартыю.

— Мы, гаворыць тав. Фішар,— прыехалі ў Совецкі Саюз, краіну пераможнага пролетарыята, будуючага соцыялізм, каб вучыцца змагацца і перамагаць буржуазію.

— Мы зараз вашы госці, але страсна жадаем, каб вы былі гасц[...] ЧЫРВОНАЙ АЎСТРЫІ, ЧЫРВОН[...] ВЕНЫ.

Гэтыя словы пакрываюцца ма[...]ным «ура» ў гонар аўстрыйскіх п[...]етараў. Сустракаючыя і госці [...]юць «Інтэрнацыянал».

**

Сустрэча менскіх рабочых з [...]стрыйскімі шуцбундаўцамі выліл[...] ў магутную дэманстрацыю пролет[...]скага адзінства і інтэрнацыянальн[...] салідарнасці. Яна яшчэ больш па[...]зала значэнне Совецкага Саюза — бацькаўшчыны сусветнага проле[...]рыята. Яна яшчэ больш падкрэс[...] па здрадніцтва лідэраў соцыял-[...]шыстаў і рост рэволюцыйных наст[...]яў рабочых Захада, якія ўсё бо[...] пераконваюцца, што адзіным іх п[...]вадыром у класавай барацьбе з [...]піталам з'яўляецца толькі комп[...]тыя, толькі Комінтэрн.

**

У СССР прыбыла ўсяго 306 шу[...]бундаўцаў, прабраўшыхся пасля [...]стання ў Чэха-Славакію і там ін[...]ніраваных. Яны знаходзіліся ў п[...]рах. Сярод прыехаўшых комуніс[...], соцыял-дэмакраты і шмат бесп[...]тыйных.

М. КІ[...]

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ШКОДНІКІ АТРЫМАЛІ ПА ЗАСЛУГАХ

НА ПРАЦЭСЕ ЗНІШЧАЛЬНІКАЎ ЖЫВЁЛЫ

(Ад спецыяльнага карэспандэнта „Звязды")

ДУБРОЎНА, 21. Перад судом праходзіць група спекулянтаў, якія сістэматычна ўздувалі цэны на жывёлу на калгасным рынку.

Вось характэрная фігура **С. Фелера**, былога гандляра, лішэнца, які пралез у апарат Гарно на пасаду загатоўшчыка. Пры ўдзеле старшыні Гарно, сына паліцэйскага **Новікава**, Фелер дабіўся перавышэння канвенцыйных цэн на 17.642 рублі.

Пад шыльдай кааператыўнага ларка Фелер прадаваў мяса па камерцыйнай цане ўсяму насельніцтву. Не гледзячы на спецыяльную пастанову камісіі па чыстцы партыі ў Дубровенскім раёне аб зняцці С. Фелера з работы, Новікаў увесь час трымаў яго на «няштатнай» пасадзе.

— Не было кім замяніць, у Дуброўне няма спецыялістаў...—адказвае суду Новікаў.

Вось упаўнаважаны па дэцэнтралізаваных загатоўках па Дубровеншчыне ад ОРС'а Волхаўскага алюмініевага камбіната **Печнікаў**. Узяўшы рынак у м. Лядах у свае рукі, Печнікаў разам са спекулянтамі, накшталт лішэнца Куніна, вёў шкодніцкую работу па забою прадукцыйнай жывёлы. Печнікаў арганізаваў тайную бойню, сістэматычна парушаў канвенцыйныя цэны пры закупцы буйнай рагатай жывёлы.

Вось спекулянт **Ш. Булах.** Увесь час ён займаўся маклерствам, пасрэдніцтвам, падрабляў фальшывыя распіскі. Булах заўсёды абважываў сялян пры разрубцы мяса ў кааператыўным ларку.

Далей перад судом праходзяць пралезшыя ў калгас «Перамога» кулакі **Якімаў і Салянкоў**, якія таксама праходзяць перад судом, як злосныя знішчальнікі прадукцыйнай жывёлы. За 4 месяцы сваёй «дзейнасці» Якімаў знішчыў 3 свінні. Пры ім у калгасе загінула 50 проц. апаросаў. Якімаў краў калгасную маёмасць, п'янстваваў з кулакамі, актыўна шкодзіў калгасу і дзяржаве.

Якімаву шчыра дапамагаў яго намеснік Салянкоў (загадчык гаспадаркі «Перамога»), які пакраў каля 4 тон збожжа, прыпісваў сабе і іншым кулакам лішнія працадні, пагнаіў у калгасе многа бульбы, ільну, жыта, спрыяў раскрадванню свінога пагалоўя.

Работнікі райза—былы загадчык, сын жандарма Новікаў, заатэхнікі—кулацкія сынкі **Драбышэўскі і Васіленка,** ветурач **Гутараў** злачыннай нядбайнасцю да справы жывёлагадоўлі, бяздушнымі, чыноўніцкімі адносінамі да справы пакрывалі гэтыя злачынствы. Яны фактычна нясуць поўную адказнасць за знішчэнне жывёлы ў Дубровенскім раёне.

Такім чынам, як зусім правільна падкрэсліў у сваёй прамове намеснік пракурора рэспублікі т. Шыфрын, мы маем на лаве падсудных букет хабарнікаў, кулакоў, спекулянтаў, п'яніц.

Пры адсутнасці рэвалюцыйнай пільнасці з боку кіруючых работнікаў раёна, гэта група класавых ворагаў бесперашкодна вяла сваю шкодніцкую дзейнасць, накіраваную на знішчэнне прадукцыйнага стада жывёлы ў Дубровеншчыне.

Тав. Шыфрын патрабуе ад пралетарскага суда суровай меры сацыяльнай абароны ў дачыненні да гэтай групы.

***

Пасля 4-гадзіннай нарады сесія Вярхоўнага суда вынесла свой прыгавор, спатканы ўсім залам з поўным задавальненнем.

Кулак Салянкоў асуджан да 10 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях Саюза, былы старшыня калгаса «Перамога, **Якімаў** і заатэхнік **Васіленка**—да 3-х год; спекулянты—браты **Фелеры і Булах** — да 5 год, хабарнікі ветработнікі: **Лестнікаў** — да 7-мі, Шкрабнёў і Гаўрыльчык—да 5 год, Печнікаў, Шін і Драбышэўскі атрымалі па 1 году прымусовых работ кожны.

Райветурач **Гутараў** прысуджан да 6 месяцаў прымусовых работ па месцу работы, былы загадчык райземаддзела **Новікаў**—да 3-х месяцаў і заг. райза Галубчыкаў—да 1 месяца.

Дубровенская справа, павінна паслужыць урокам для ўсіх раённых арганізацый. Гэта справа сведчыць яшчэ раз аб тым, што там, дзе хоць на хвіліну згублена рэвалюцыйная пільнасць, класавы вораг не без поспеху прабуе весці сваю падрыўную работу.

Гэта справа сведчыць яшчэ раз і аб тым, што партыя і савецкая ўлада нікому не дазволяць зрываць мерапрыемствы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Шкоднікі сапраўды атрымалі па заслугах.

Ю. ЛЯВОННЫ.

„ЗАЎТРА ДАГАВАРЫМСЯ"

(Пісьмо ваеннаслужачага)

У Варатынскім сельсовеце, **Бабруйскага раёна**, ніхто не праводзіць палітычна-масавай работы сярод дапрызыўнікаў 1912 года нараджэння. Дагавор соцспаборніцтва, заключаны з **Туркоўскім** сельсаветам на лепшую пастаноўку масавай работы сярод дапрызыўнікаў, не выконваецца выключна па нядбайнасці старшыні сельсовета і камісіі садзейнасці прызыву. Выдзеленая брыгада з дапрызыўнікаў праз брыгадзіра тав. **Пранопчыка** не раз зварачалася да старшыні камісіі за дапамогай у рабоце, але апошні адказвае: «Добра, заўтра дагаваруся з парторгам сельсовета і справу зварухнём».

А ў выніку — ніякага зруху.

Пара ўмяшацца ў гэту справу РК КП(б)Б і дапамагчы хутчэй «дагаварыцца».

ЯКУБАЎ.

ЗА ШЫРМАЙ ЗВОДАК

ПРОФСАЮЗЫ — дрэнна кіруюць індывідуальным рабочым агародніцтвам

У ЦСПСБ святкуюць перамогу. Загадчык аддзела рабочага снабжэння тав. **ГЕРАЎКЕР** самазадаволена паціраe рукі: мы выканалі і перавыканалі. Гутарка ідзе аб **індывідуальным рабочым агародніцтве.**

Афіцыяльныя лічбы зводкі вабяць вока: 21.000 рабочых надзелены зямельнымі ўчасткамі для агародаў. «Гэта апрача чыгуначнікаў, рабочых лесасплава і соўгасаў»—дадае зводку тав. Гераўкер.

„ГЛЯДЗІ Ў КОРАНЬ"

21.000—гэта гучыць горда! На цэлую тысячу больш кантрольнай лічбы, вызначанай СНК БССР у пастанове ад 4 студзеня!

Але яшчэ Кузьма Прутков сказаў: **«глядзі ў корань».** Паследуем гэтай мудрай парадзе: паглядзім, што ўяўляе сабой зводка.

Тав. Гераўкер сам прызнае адну графу гэтай зводкі несапраўднай: кантрольныя заданні раёнам запісаны ў зводцы толькі для формы.

— У сапраўднасці гэтыя заданні ніякага значэння не маюць і ў раёнах з імі амаль не лічыліся.

Зямельныя ўчасткі адводзіліся бясспланава, выпадкова. І таму зусім натуральна паўстае пытанне: наколькі сапраўдна і другая частка зводкі—графа аб фактычным адводзе зямель. Ці не з'яўляецца яна такой-жа фількінай граматай, як і першая частка?

Звернемся да фактаў. У зводцы запісана: па Менску адведзена 327 га зямлі 3.272 сем'ям.

Атрымалі 6 гектараў зямлі і рабочыя **друкарні імя Сталіна.** Адвялі ім зямельны ўчастак каля Клінічнага гарадка, кожны рабочы атрымаў па 0,1 гектара. Закупілі насенне. Пасля доўгіх клопатаў здабылі бензін, нанялі машыну. Дагаварыліся з падшэфным палком—у выходныя дні рабочыя пачалі вывозіць гной з канюшняў на агароды. Сабраліся сеяць. І вось раптам усё рухнула, разляцелася як картачны домік. У адзін прыгожы веснавы дзень на ўчастак, адведзены для рабочых агародаў, з'явіліся незнаёмыя людзі з землямернымі інструментамі—нешта падлічвалі, запісвалі, вымервалі. Аказваецца, Клінічны гарадок адрэзаў для сваіх патрэб 2 гектары. Не дапамаглі скаргі ў горсовет, ЦСПСБ, камгас. Усе вельмі спачувалі, шмат абяцалі, але нічога рэальнага не зрабілі.

Фабком друкарні ў замяшанні. Трэба пераразмяркоўваць участак спачатку, прычым няма ніякай гарантыі, што не забяруць і астатнюю зямлю. А ЦСПСБ заспакойвае: «пытанне вырашыцца». Калі? К канцу вясны? Дзякуй за ласку! З 60-ці рабочых больш паловы махнулі рукой і адмовіліся ад агародаў.

Рабочыя **фабрыкі імя Фрунзе** атрымалі ўчастак у раёне чыгункі, пашлі сеяць. Аказалася, што частку зямлі адведзенай для фабрыкі імя Фрунзе, атрымалі рабочыя завода «Пралетары».

У зводцы—высокая лічба і па Магілёву. Але і яна выклікае сумненне. На самым буйным прадпрыемстве Магілёва—**шоўкавай фабрыцы**—рабочыя не атрымалі зямлі пад агароды. Горсовет забраў 12 гектараў у каапгаса шоўкавай фабрыкі і перадаў іх пад індывідуальны агарод. Фабрычныя арганізацыі запратэставалі. І вось ідуць гарачыя спрэчкі, а справа не рушыцца з месца.

У Рэчыцы, як ужо паведамляла «Праўда», забралі пад агароды зямлю ў прыгараднай гаспадаркі запалкавай фабрыкі і «ўмылі рукі»—заданне выканана.

Так выглядаюць на справе «аптымістычныя» лічбы, якімі аперуюць у ЦСПСБ.

ПАД АДНУ ГРАБЁНКУ

Індывідуальнае рабочае агародніцтва—справа зусім новая. ЦСПСБ абавязан быў разгарнуць самую шырокую растлумачальную работу, папулярызаваць прынцыпы індывідуальнага агародніцтва, даць нізавым профарганізацыям вычарпальныя ўказанні, як на практыцы адводзіць рабочым участкі.

Гэтага не зроблена. Таму ў многіх мясцах груба скажаюць дырэктывы партыі і ўрада аб рабочым індывідуальным агародніцтве.

Менскія чыгуначнікі атрымалі 30 гектараў зямлі пад агароды. Замест таго, каб размеркаваць гэтую плошчу паміж рабочымі, замацаваць за кожным поўны ўчастак, прафарганізацыі чыгункі (груз чыкаў, службы цягі) стварылі своеасаблівы «калгас», вывезлі гной на ўвесь масіў. Яны збіраюцца засеяць яго калектывам і толькі пасля сяўбы размеркаваць зямлю. Ні адзін рабочы не ведае дзе яго ўчастак, усе спадзяюцца выключна на прафком: «ён усё зробіць». Прафарганізацыі чыгункі не зразумелі, што трэба разгарнуць рабочую ініцыятыву, стварыць такія ўмовы, каб рабочыя былі непасрэдна зацікаўлены ў добрай апрацоўцы зямлі.

На радзе прадпрыемстваў участкі пад індывідуальныя агароды размеркаваны па прынцыпу строгай ураўнілаўкі. Агульны масіў падзялілі на роўныя часткі ў адпаведнасці з колькасцю надзяляемых. Заўком **дрэваапрацоўчага завода імя Молатава** (Менск) падзяліў 10 гектараў пароўну паміж 100 рабочымі—кожнаму 0,1 гектара, незалежна ад колькасці членаў сям'і.

Старшыня заўкома менскага Хлебазавода тав. **ГРЫШЫН** лічыць ураўнілаўскі падзел «адзіна правільным метадам». Ён здзіўлена паціскае плячымі, калі яму гавораць аб недапушчальнасці ўраўнілаўкі: «Мы атрымалі 4 гектары, падзялілі іх паміж 32 рабочымі—кожнаму па 1/8 гектара,—ніхто не пакрыўдзіў».

Гэта робіцца ў Менску на вачах ЦСПСБ. А што ўжо гаварыць аб перыферыі! Там яшчэ больш скажаюць дырэктывы аб рабочым агародніцтве. На буйнейшым прадпрыемстве Бабруйска—**дрэваапрацоўчым камбінаце** — вызначаны ўчастак пад індывідуальныя агароды размяркован таксама па прынцыпу ўраўнілаўкі—кожнаму па адной восьмай гектара.

Такі рэзультат адсутнасці кіраўніцтва і інструктажу.

НАРАДЫ ЗАМЕСТ НАСЕННЯ

Партыя і ўрад абавязалі ўсе арганізацыі аказаць рабочым, атрымаўшым агароды, дапамогу насеннем, цягавай сілай, інвентаром. У ЦСПСБ пацяшаюць сябе думкай, што мясцам пасланы нарады на насенную бульбу. Значыць рабочыя забяспечаны асноўным відам насення.

Нарады сапраўды размеркаваны. Але ці значыць гэта, што ў рабочых ужо ёсць насенне? Ні ў якім разе. Ва многіх мясцах атрыманыя нарады дагэтуль не рэалізаваны. Гомельскія прадпрыемствы павінны былі атрымаць 370 тон бульбы з Прапойска, а атрымалі толькі 225. Магілеўскія прадпрыемствы атрымалі з Старобінскага раёна 150 тон замест 300. 150 тон ляжыць на станцыі Слуцк, бо дырэктар Белплодагароднiны **АНІКЕЙЧЫК** сарваў пагрузку насеннай бульбы для рабочых агародаў.

Полацку далі нарад на 60 тон бульбы. Вывезці яе трэба з Ушацкага раёна. Але вывезлі толькі 32 тоны. Астатнюю бульбу райпрафсовет і ЦРК «празявалі».

Заўком Менскага Хлебазавода атрымаў для размеркавання паміж рабочымі-агароднікамі 3 тоны насеннай бульбы. Гэтай колькасці хапае толькі на абсемяненне 32 участкаў. Між тым атрымаць агароды жадаюць каля 65 чалавек. Хлебазавод мог-бы задаволіць участкамі ўсіх жадаючых—зямля ёсць, але няма насення. У ЦСПСБ абяцаюць «вырашыць пытанне».

УГНАЕННЕ Ў... КОШЫКАХ

Аб вывазцы гною профсаюзныя арганізацыі ўспомнілі толькі ў красавіку, калі сонейка ўжо пачало прыпякаць. Люты і сакавік праспалі. Але і зараз вывазка гною тармозіцца ў значнай меры з-за адсутнасці транспарта. Дырэктары многіх прадпрыемстваў глядзяць на індывідуальнае агародніцтва як на «чужую справу», не аказваюць рабочым практычнай дапамогі.

Дырэктар завода «Комунар» тав. **ПАЖЫВІЛКА** і ЗРК нічога не зрабілі, каб дапамагчы рабочым у вывазцы гною. На **Хлебазаводзе** з-за адсутнасці транспарта гной не вывозіцца. Рабочым параілі збіраць попел і... кошыкамі несці яго на ўчасткі, якія, дарэчы, знаходзяцца ў 6 кілометрах ад горада.

Вялікую ролю адыгрывае забеспячэнне рабочых сельска-гаспадарчым інвентаром для апрацоўкі агародаў. Гэта задача ўскладзена на Белкаапсаюз і кааперацыю. Але ні ў адным магазіне Менска і іншых гарадоў не знойдзеш граблёў, леек, палівальнікаў і вёдраў. Белкаапсаюз і промкааперацыя не паклапаціліся аб забеспячэнні магазінаў гэтымі таварамі. А ЦСПСБ і ЦП Саюза толькі цяпер, калі рабочыя скардзяцца на адсутнасць інвентара, пачалі сігналізаваць».

Дзе-ні-дзе па індывідуальных агародах пачалася сяўба. Але дзе, колькі і як пасеяна—не ведаюць ні ЦСПСБ, ні ЦП саюзаў.

Ужо з першых дзён сяўбы кідаецца ў вочы адсутнасць кіраўніцтва гэтай справай. Бо як можна кіраваць, не ведаючы фактычнага становішча на мясцах?

БУТОМАЎ. ГАЛКІН.



Ударнік-трактарыст калгаса Менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча КУЗНЯЦОЎ барануе поле для пасеву вікі.

ПЕРАСЯЛЕННЕ

Для расшырэння завода ланцугоў Галля патрабавалася аслабаніць памяшканне інтэрната тарфянога тэхнікума. Супроць перасялення студэнтаў у іншае памяшканне наўрад ці можна было пярэчыць. Дый самі студэнты не сталі-б пратэставаць супроць гэтага, калі-б яны своечасова былі папярэджаны і ім было прадастаўлена другое падыходзячае памяшканне. У менскага горсовета было для гэтага досыць часу, бо справа цягнецца яшчэ з восені мінулага года.

Аднак, у работнікаў горсовета свае асобыя метады жыллёвага задавалення грамадзян. У памяці менскіх асветнікаў яшчэ свежы выпадак, калі загадчык комгаса тав. **Бімбат** чуць не поччу ўсяліў у будынак жакта «Асветнік» асоб, якія да асветнікаў ніякага дачынення не маюць. Бывае і горш. Бывае і так, што на адну і тую-ж кватэру выдаецца некалькі ордэраў і тады пытанне аб тым, чый-жа ордэр сапраўдны, вырашаецца, так сказаць, суадносінамі сіл змагаючыхся ўладальнікаў ордэраў.

Усё гэта, аднак, чысцейшае саматужніцтва ў параўнанні з перасяленнем студэнтаў. Масавае перасяленне патрабавала строга распрацаванага плана дзеяння. Такі план і быў распрацован з усёй стараннасцю, а, галоўнае, ажыццёўлен з зусім выключнай аператыўнасцю.

Справа пачалася так. Вечарам 19 красавіка ў памяшканні інтэрната вышэйшага пединститута ў суправаджэнні міліцыянера з'явіўся пам. нач. комгаса тав. **Юдзін.** Студэнты інстытута ў гэты час былі на занятках. Момант, такім чынам, выключна спрыяючы для раптоўна быстрых дзеянняў. І тав. Юдзін ім карыстаецца. Ён забіраецца ў пакой адсутнай прыбіральшчыцы, знімае са сцяны вязку ключоў і адпраўляецца з міліцыянерам аглядаць спальні студэнтаў. У рэзультаце лёгкай рэкагнастыроўкі студэнцкая сталоўка і пральня апячатваюцца, прабаваў т. Юдзін апячатаць і памяшканне санітарнага пункта.

Праз 20-30 мінут пасля гэтай аперацыі к інтэрнату тарфянога тэхнікума падкатваюць 3-4 грузавікі з міліцыянерам і некалькімі рабочымі на чале з Юдзіным і дырэктарам завода ланцугоў Галля. Студэнтаў тут таксама не было.

Пяць-шэсць прысутных студэнтаў і камендант будынка пачалі пратэставаць супроць падобнага перасялення.

— Прыдуць студэнты, самі ўкладуць свае рэчы і правядзем перасяленне арганізавана,—рэзонна ўгаварылі прысутныя.

Ні пратэсты, ні ўгаворы не дапамаглі. Пратэстуючыя камендант будынка, сакратар комсамольскага калектыва тав. Рагавой, парторг тав. Шахрай, старшыня прафкома Пінчук аб'яўляюцца... арыштаванымі.

Малюнак штурму быў упячатлівы. Узломваліся дзверы, рэчы студэнтаў выкідваліся праз вокны, у паветры вісела адборная лаянка. На грузавікі студэнцкае дабро грузілася, як кажуць чыгуначнікі, у навал. Памяшканне інтэрната торфтэхнікума было такім чынам з поспехам вызвалена.

Аднак, план горсовета гэтым яшчэ не быў выканан да канца. Усё-ж нельга было пакінуць студэнтаў торфтэхнікума, перакінутых з рэчамі ў студэнцкі гарадок, у калідорах студэнцкіх інтэрнатаў, а магчыма і пад адкрытым небам. Гэта дало-б сур'ёзны повад да неўгрунтаванага абвінавачання работнікаў горсовета ў адсутнасці ўвагі да «жывога чалавека». Тым больш, што сярод кіраўшых перасяленнем былі даволі адказныя работнікі горсовета.

Справа была давершана на наступны дзень. Пасля некаторай нерадышкі пачаўся штурм інтэрната педагагічнага і медыцынскага інстытутаў і другіх навучальных устаноў, каб як-небудзь ушчыльніць іх. Пры дапамозе міліцыі выкідваецца са сталовай педагагічнага інстытута мэбля і звальваецца ва ўмывальным пакоі. Такім-жа чынам аслабаняюцца чырвоныя куткі і іншыя пакоі ў медыцынскім інстытуце, фізкультурным і іншых тэхнікумах. Справа набывае драматычны абарот, калі некаторыя разгарачаныя галовы студэнтаў прабуюць аказаць супраціўленне. Драматызм дзеяння дасягае свайго апагея, калі нейкая студэнтка, не пажадаўшая самаўшчыльніцца, была абвінавачана ў тым, што яна ні што іншае, як «антысовецкі элемент» і «вораг народу». Нарэшце, усё ўладзілася і перасяленне было завершана.

Аддаючы належнае энергіі, аператыўнасці і імклівасці дзеянняў асоб, кіраваўшых перасяленнем, мы, аднак, выказваем сумненне, каб усе гэтыя добрыя якасці былі ўмесны ў даным выпадку і каб яны ў падобнай справе павялічвалі прэстыж работнікаў горсовета.

Больш таго, мы лічым, што такія рашучыя асобы, не ведаючыя, куды дзець сваю энергію, павінны быць правучаны совецкім судом.

За адно з імі павінны адказаць і тыя кіраўнікі закранутых перасяленнем ВНУ, якія, наадварот, праявілі ў гэтай справе дзіўную пасіўнасць і аказаліся ў «нецях», хоць яны не маглі не ведаць аб перасяленні.

В. З.

М. ЗЛОТКІН

ЗА САПРАЎДНУЮ ПЕРАБУДОВУ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ

Перабудова партработы на аснове пастаноў XVII партыйнага з'езду нас, у Беларусі, некалькі зацягнулася. Прычым больш зацягнулася яна ў сельскіх партарганізацыях.

Многія партыйныя работнікі [illegible]ны тлумачыць гэту зацяжку жаданнем глыбей правесці перабудову. Але праверка па раду партарганізацый (Магілеў, Бабруйск, Барысаў і інш.) паказала, што не ў гэтым справа. Многія думаюць, што вось, моў, змянілі структуру, змянілі формы і назву, увялі палітаддзелы, дзеннікі і перабудова закончана. Гэта і ёсць фармальная перабудова, бо сутнасць перабудовы якраз не ў гэтым. Часта палітаддзелы доўгімі дзеннікамі аказёньваюць перабудову, засланяюць жывых людзей і прадаўжаюць пад новай формай засядацельскую мітусню і бюракратычную перапіску. Замест ранейшых пасяджэнняў прыдумваюць нарады з новымі назвамі (нарада трыкутнікаў і [illegible]ыя).

[illegible]ад гэтай апаратыўнасцю часта [illegible]ца неразуменне многімі партыйнымі кіраўнікамі канкрэтных задач партработы. Сакратар парткома, парторг часта хапаюцца за [illegible]вы, якія павінен вырашаць [illegible]эктар, начальнік цэха, і гэтым самым ствараюць безадказнасць, парушаюць адзінаначалле, а сваёй непасрэднай партработы не праводзяць. Атрымліваецца тое, што часта не адрозніш начальніка цэха ад парторга, брыгадзіра ўчастка ад групарторга і т. д.

Задача партыйных работнікаў не падмяняць майстра, начальніка цэха, не быць агентам па снабжэнню, хадайнікам па розных справах, а працаваць з кожным комуністам, займацца партыйнай работай. Толькі тады ў нас будзе сапраўдная перабудова.

У чым прычына фармальнай перабудовы? Першая і асноўная прычына ў тым, што прапрацоўка рашэнняў XVII партыйнага з'езда праходзіць фармальна. Праўда, мы маем у радзе арганізацый безумоўна жыццёвую і карысную форму прапрацоўкі, як прапрацоўка на даму ў сем'ях рабочых, прапрацоўка ў партшколах, у палітгурках. Але самы асноўны недахоп—гэта адсутнасць дзейснасці ў гэтай прапрацоўкі. Няма таго глыбокага асмыслівання матэрыяла, якое-б дало сапраўдныя рэзультаты ў рабоце цэха, агрэгата, істужкі, брыгады. Іменна дзейснасці гэтай няма. І нават там, дзе здаюць палітэкзамен на «выдатна», мы маем факты, што выдатнік часамі не зразумеў усёй глыбіні рашэнняў XVII з'езда.

Член партыі—у цэнтры перабудовы

Асноўны сэнс перабудовы заключаецца ў тым, каб расставіць партыйныя сілы так, каб яны праз цэлы рад прыводных пасаў, якія мае наша партыя, забяспечылі кіраўніцтва партарганізацыі ўсёй масай рабочых. Пры гэтым трэба памятаць, што рабочая маса таксама не аднародна. Мы маем сярод рабочых высокакваліфікаваных і малакваліфікаваных, старых рабочых, даўно працуючых на вытворчасці, і толькі што прышоўшых на фабрыку, на завод. А гэта патрабуе дыферэнцыяванага падыходу да кожнай з гэтых груп. Трэба расставіць членаў партыі, кандыдатаў, спачуваючых, комсамольцаў так, каб уплываць і мець цесную сувязь з кожнай з гэтых груп. Вось гэта і будзе перабудова партработы. А гэта значыць, што кожны член і кандыдат партыі, комсамолец павінны быць у поўным сэнсе палітычным важаком.

Для гэтага кожны член і кандыдат партыі павінен няспынна ўздымаць свой ідэйна-палітычны ўровень, працаваць над аўладаннем асноў тэорыі Маркса-Леніна-Сталіна, павінен сам добра асмысліць палітычныя задачы, што стаяць у цэлым перад усёй партыяй і перад імі, як членам або кандыдатам гэтай партыі, каб заўсёды знайсці правільны адказ для сябе і быць падрыхтаваным даць яго беспартыйнаму рабочаму.

А гэта значыць, што кожнага члена і кандыдата партыі трэба ўзброіць тэорыяй марксізма-ленінізма. У сваім дакладзе на XVII партыйным з'ездзе тав. **Кагановіч** сказаў, што «бальшэвік не можа абмяжоўвацца простай верай у соцыялізм падобна таму, як верыць рэлігійны чалавек у царства нябеснае. Не, бальшэвік — гэта член такой партыі, праграма, палітыка і тактыка якой будуюцца на строга навуковых асновах марксізма-ленінізма, бальшэвік — гэта той, хто разумее немінучасць краху капіталізма, немінучасць дыктатуры пралетарыята, забяспечваючы перамогу соцыялізма. Таму кожны член партыі павінен аўладаць асновамі марксізма-ленінізма».

Адсюль першы абавязак кожнага партыйнага работніка—дапамагчы члену і кандыдату партыі падняць свой ідэйна-палітычны ўровень.

Між тым, у нас часта маюць месца пагардлівыя адносіны да марксісцка-ленінскай вучобы. Часамі член партыі хваліцца тым, што ён арганізатар, а не прапагандыст, што яму няма калі чытаць газеты, няма калі займацца справамі прапаганды. Праўда, трэба сказаць, што пасля чысткі партыі менш сталі хваліцца тым, што не працуюць над сабой. Чыстка паказала такім партыйцам, што наша бальшэвіцкая партыя не будзе цярпець у сваіх радах членаў партыі, якія пагардліва адносяцца да аўладання тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна, да падняцця свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Вось гэта размежаванне, што мая справа — гэта арганізацыйная работа, а вучоба—гэта справа прапагандыста, не можа мець месца. Тав. Кагановіч на XVII партыйным з'ездзе асабліва падкрэсліў, што кожны партыйны кіраўнік павінен быць не толькі арганізатарам, але і прапагандыстам і выхавацелем членаў партыі. Часта чуеш гутаркі аб тым, што «я, моў, прапагандыст, але не арганізатар». Нам не трэба такіх бязрукіх прапагандыстаў. Трэба, каб прапагандыст быў арганізатарам, добра ведаў інтарэсы і патрэбы сваіх слухачоў. Не аўладаўшы тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна, нельга быць добрым арганізатарам.

Арганізацыйныя пытанні заўсёды займалі буйнае месца ў барацьбе нашай партыі. Асабліва важнае, рашаючае значэнне набываюць арганізацыйныя пытанні на этапе другой пяцігодкі. Адзінства ідэйна-палітычнай і арганізацыйнай работы, адзінства арганізацыйных і праграмных пытанняў — гэта адзінства слова і справы, якое заўсёды адрознівала і адрознівае партыю бальшэвікоў ад буржуазных і дробна-буржуазных партый. Бальшэвіцкая партыя таму і перамагае, што ў яе няма разрыву паміж словам і справай.

Таму іменна наша партыя заўсёды ставіла пытанне аб выхаванні комуніста і кандыдата партыі ў духу адзінства рэвалюцыйнага слова і справы. Комуніст павінен заўсёды і ва ўсім паказваць прыклад. Павышаючы свой ідэйна-палітычны ўровень, авалодваючы тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна, ён павінен таксама павышаць сваю дзелавую, вытворчую кваліфікацыю, бо калі член або кандыдат партыі не ведае добра сваёй справы, ён не можа карыстацца аўтарытэтам, ніхто не будзе яго слухаць. Такі комуніст не можа весці на вытворчыя перамогі беспартыйную масу рабочых. Вось чаму ў новым статуце гаворыцца, што «член партыі абавязан: а) захоўваць найстражэйшую партыйную дысцыпліну, прымаць актыўны ўдзел у палітычным жыцці партыі і краіны, праводзіць на практыцы палітыку партыі і рашэнні партыйных органаў; б) нястомна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброеннасці, над усваеннем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэнняў партыі і растлумачваць іх беспартыйным масам; в) як член кіруючай партыі ў совецкай дзяржаве — быць узорам захоўвання працоўнай і дзяржаўнай дысцыпліны, аўладаць тэхнікай сваёй справы, безупынна павышаючы сваю вытворчую, дзелавую кваліфікацыю».

Зусім ясна, што буйная соцыялістычная гаспадарка патрабуе моцнай, свядомай дысцыпліны і ведання тэхнікі, а гэта ў сваю чаргу немагчыма без палітычных ведаў. Без гэтых умоў не можа быць паспяховага развіцця калектыўных форм работы.

Адсюль зразумела, што сутнасць перабудовы партработы заключаецца іменна ў тым, каб падняць на нязмерную вышыню боездольнасць кожнага члена і кандыдата партыі, яго ідэйна-палітычны, культурны, тэхнічны ўзровень, зрабіць кожнага члена і кандыдата партыі палітычным і вытворчым важаком на канкрэтным участку соцыялістычнай будоўлі. Вось чым павінны займацца парткомы, цэхоргі, партыйныя работнікі нізавых звенняў, агрэгатаў, участкаў.

Удумліва праводзіць перабудову

Многія думаюць, што справа перабудовы партработы вырашаецца ліквідацыяй лішніх звенняў. Сама па сабе гэта ліквідацыя яшчэ не азначае перабудовы. А трэба іменна так арганізацыйна перабудаваць партыйную арганізацыю, каб кожны член і кандыдат партыі меў уплыў і арганізоўваў беспартыйных рабочых на канкрэтных вытворчых працэсах.

Прывяду некалькі прыкладаў. Возьмем **Бабруйскі лесакамбінат.** Як там праведзена перабудова? Стварылі партком, цэхпарторгаў. І вось што атрымалася ў лесацэху № 1. Адзін парторг ядзае над сваім кіраўніцтвам тры змены, а ў кожнай змене пяць раз. У цэху 35 комуністаў, а парторг платны. Гэта, па-першае, парушэнне статута, а, па-другое, усё роўна

З РЭЧАВЫМІ ДОКАЗАМІ...

Сустрэча была надзвычайнай. Спажывец і работнік прылаўка спаткаліся не ў магазіне, не ў парку, а ў клубе на сумеснай канферэнцыі, скліканай «Звяздой», Белкаапсаюзам і ЦП саюза работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю.

Спажывец прышоў з «рэчавымі доказамі». У фае клуба былі выстаўлены красамоўныя экспанаты: неахайна пашытае паліто, нягодныя балеткі, брудная, уся ў плямах, бялізна, зусім папсаваныя цукеркі.

Гэты брак узят з магазінаў. Гэтым бракам гандлёвая кааперацыя, ім снабжае яна спажыўца.

Зусім нядаўна рабочыя Горкаўскага аўтазавода прад'явілі соцыялістычны рахунак швейнай і абутковай прамысловасці БССР. Аўтазаводцы зусім правільна скардзіліся на нізкую якасць і дрэнны асартымент тавараў шырокага спажывання, якія яны атрымліваюць з БССР. Гэты соцыялістычны рахунак па сутнасці адносіцца і да гандлёвай сістэмы. Імення яна з'яўляецца звязваючым звяном паміж масай спажыўцоў і прамысловасцю, імення яна закліканы абараняць інтарэсы рабочага пакупніка ,снабжаць яго высокаякаснай прадукцыяй.

Але з гэтай задачай гандлёвая сістэма спраўляецца дрэнна. Выступленні на канферэнцыі спажыўцоў і работнікаў прылаўка па сутнасці з'явіліся другім соцыялістычным рахункам гандлёва-кааператыўным работнікам. І ўступнае слова прадстаўніка рэдакцыі «Звязды» тав. РАБЦЭВІЧА, і даклад нам. старшыні Белкаапсаюза тав. МАТУСЕВІЧА, і спрэчкі па дакладу стракацелі шматлікімі фактамі дрэннага абслугоўвання спажыўца, ігнаравання яго запатрабаванняў. Брак запаўняе паліцы магазінаў, брак замарожвае сотні тысяч рублёў зваротных сродкаў, тармозячы таваразварот, брак трапляе да спажыўца...

Успомнім матэрыялы, выяўленыя рэйдам брыгад «Звязды», Белкаапсаюза і ЦП саюза работнікаў кааперацыі і дзяржгандлю па магазінах і базах Менска. Хіба не абураючы факт, што ў спецыяльных швейных магазінах Менска цяпер, у цёплыя веснавыя дні красавіка, паліцы завалены нізкаякаснай зімовай вопраткай, а сезонных паліто і касцюмаў няма?

Швейныя фабрыкі БССР выпускаюць многа прадукцыі. У Менску, Віцебску, Бабруйску і іншых гарадах ёсць дастаткова добрага адзення. Але некаторым работнікам выгадней атрымаць процанты і камандыровачныя. Таму розныя Хаюціны (МГРК) і Якісбергі (Аршанскі райсаюз) едуць на Украіну ,на Каўказ. Яны закупляюць сапраўднае барахло на сотні тысяч рублёў і спакойна атрымліваюць за гэта ўзнагароду. «Тавар» ляжыць месяцамі ў магазінах, яго ніхто не купляе. Тым не менш кааператары не робяць уцэнкі, выдаюць брак за добраякасную прадукцыю.

Зусім правільна выступаўшыя на канферэнцыі кваліфікавалі такую, з дазволу сказаць, «работу», як проста злачынства, якое заслугоўвае суровага пакарання.

У некаторых магазінах работнікі прылаўка лічаць, што яны робяць ласку спажыўцу, калі гавораць з ім. У магазіне № 96 МГРК усё яшчэ імкнуцца прымусіць спажыўца пакупаць па прынцыпу «бяры што даюць». Выбраць падыходзячы абутак пакупнік не мае права... У спецыялізаваным абутковым магазіне няма абутку для дзяцей 4-8 год. Ды ці толькі ў гэтым магазіне. Хто даў кааперацыі права ігнараваць патрэбы дзяцей працоўных? Няўжо нашы дзеці павінны хадзіць босыя? (З выступлення работніцы хемфармзавода тав. МАР'ЯСІНАЙ).

Вельмі характэрна: ЗА ЎВЕСЬ 1933 ГОД І ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ 1934 г. НІ АДЗІН МАГАЗІН ЗРК НЕ ПРАД'ЯВІЎ БАЗЕ АБО ПАСТАЎШЧЫКУ ПРЭТЭНЗІЮ ЗА ТАВАРЫ ДРЭННАЙ ЯКАСЦІ.

**

На канферэнцыі выступалі таксама т.т. МЕЕРЗОН, ДРАГІЛЕЎ, ЖАРНОЎ, НАЙМАН, КАБАКОЎ, КАРПУСЕНКА, ЦЭЦЭНСКІ і інш.

Канферэнцыя ярка паказала кожнаму работніку прылаўка, чаго патрабуе ад яго спажывец, як гандлёвыя работнікі павінны перабудаваць сваю работу.

Б. Г.

„Прелести" віцебскага дома сплаўшчыкаў

(Ад віцебскіх карэспандэнтаў «Звязды»).

На беразе Дзвіны, супроць дома сплаву размясцілася група межынскіх сплаўшчыкаў — мужчын, жанчын і некалькі падлеткаў. Снедаюць. Дарожны пыл уядаецца ў вочы, падае на прадукты, якія ляжаць побач.

— Чаму-б вам, таварышы, не пайсці паснедаць у сталоўку дома сплаўшчыкаў? — задаем ім пытанне.

— Ды мы-б з задавальненнем, — адказвае самы пажылы з групы тав. **Вострыкаў Канстантын**.— Але весь не дазваляюць...

— 1 адпачыць не шкодзіла-б пасля пяці сутак у дарозе. Праплылі-ж звыш 150 кіламетраў, — дадаюць астатнія. Мы селі снедаць у сталоўцы, ды нас «папрасілі» адтуль.

Заходзім у памяшканне дома сплаву. Нас сустракае загадчык дома тав. **Шнейвальс**. Пакой біткома набіт ложкамі. Яшчэ здалёк абдае затхлым, цяжкім паветрам. Матрацы брудныя. Пасцельныя прылады не змяняліся больш тыдню. Дэзінфекцыйнай камеры няма.

Усе гэтыя «прелести» мы выявілі ўжо пасля так званага «санітарнага агляду». Ды чаго дзівіцца? Санітарнага доктара **Трафімава** і галоўурача **Зарэцкага** гэта не турбуе. Іх задача—зафіксаваць у кнізе сваю прысутнасць і пайсці.

Здраўпункт працуе дрэнна. Захварэў хто-небудзь — абавязкова чакай доктара да 7 гадзін вечара. Пастаяннага дзяжурнага доктара няма.

Пры доме ёсць сталоўка. Памяшканне сталоўкі і кухні абсталявана нядрэнна. Але за абедам сплаўшчык павінен пастаяць доўга ў чарзе, бо на **400-500** чалавек ёсць... **30** лыжак, **50** талерак і пiводнай вілкі.

Ёсць гатаваная вада, але з-за адсутнасці кружкі сплаўшчык павінен піць проста з крана.

У самым сплаўдоме на лаўцы і проста на зямлі, групамі і па аднаму размясціліся сплаўшчыкі са сваімі катомкамі.

— Давай газетку пачытаем, навіны пачуем, — звяртаецца да свайго суседа малады сплаўшчык **Максіменка Якаў**.

Але па жаль, на некалькі чалавек ёсць толькі 3 газеты па аднаму экземпляру, дый тыя — пад замком у дзяжурнага сплаўдома **Скачкова**.

— Навошта раздаваць газеты, усё роўна на курыва пойдуць, — заяўляюць старшыня райкомапрофсаюза работнікаў леса і сплава **Ульмішэк** і культработнік **Галкоўскі**.

У распараджэнні Галкоўскага — радыёўстаноўка і кіно-перасоўка. Аб іх скарыстанні «культурнікі» і не падумалі. Яны нават «забыліся» павесіць у сталоўцы і памяшканні дома хоць-бы адзін лозунг.

Так пастаўлена абслугоўванне сплаўшчыкаў у Віцебскім сплаўным доме, праз які штодзённа праходзіць па 400-500 чалавек, прарэйсаваўшых на гонках сотні кіламетраў. А кіраўнікі сплаўканторы і віцебскіх гарадскіх арганізацый не прымаюць ніякіх мер.

Зм. ПЕЦЯРЭНКА.
Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Брыгада КУПЧЫНКА за работай (Полацкі сплаўны ўчастак)

Аб выкананні плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва за 1 квартал 1934 г.

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

Совет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) не гледзячы на катэгарычныя ўказанні ўрада аб поўным і безагаворачным выкананні фінансавага плана і неаднаразовым папярэджанні аб гэтым на працягу І квартала з боку дырэктыўных і ўрадавых органаў, рад райвыканкомаў, фінансавых і гаспадарчых арганізацый у І квартале недапушчальна аслабілі работу і дапусцілі зрыў фінансавага плана І квартала (Дубровенскі РВК —47 проц., Горацкі—51 проц., Чырвонапольскі — 51 проц., Крупскі — 52 проц., Жлобінскі — 54 проц., Церахаўскі — 50,9 проц., Бялыніцкі—58 проц., Бешанковіцкі — 57,3 проц., Асіпавіцкі — 62,2 проц., Крычаўскі —64,1), у выніку фінансавы план І квартала па БССР у цэлым значна недавыканан (план мабілізацыі сродкаў выканан на 77,1 проц., плацяжы аграмаджанага сектара—на 89,6 процантаў);

б) асабліва нездавальняюча выканан план добраахвотных плацяжоў на вёсцы (пазыка, уклады ў ашчадкасы, паявыя ўзносы спажывецкай кааперацыі), што з'яўляецца вынікам непрыняцця з боку фінорганаў, РВК і сельсоветаў канкрэтных мер да ажыццяўлення дырэктыў сесіі ЦВК СССР і БССР аб арганізацыі і разгортванні масава-палітычнай работы сельсоветаў вакол выканання фінплана.

Адзначаючы гэтыя яўна нездавальняючыя вынікі выканання фінансавага плана І квартала, Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. У адпаведнасці з пастановай сесіі ЦВК і пастановай СНК БССР аб бюджэце на 1934 г. СКАРАЦІЦЬ ЗА ЯЎНЫ ПРАРЫЎ І НЕПРЫНЯЦЦЕ МЕР ДА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ВЫКАНАННЯ ФІНПЛАНА АДЛІЧЭННІ Ў МЯСЦОВЫЯ БЮДЖЭТЫ І ФІНАНСАВАННЕ ПААСОБНЫХ ПАБУДОЎ па наступных раёнах, не забяспечыўшых выкананне даходнай часткі сваіх бюджэтаў: ДУБРОВЕНСКАМУ —на 50.000 руб., ГОРАЦКАМУ—на 50.000 руб. (25.000 руб. на будаўніцтва жылога дома), ЖЛОБІНСКАМУ і КРУПСКАМУ — на 60.000 руб., ЧЫРВОНАПОЛЬСКАМУ, БЯЛЫНІЦКАМУ, — на 40.000 руб., ЦЕРАХАЎСКАМУ, БЕШАНКОВІЦКАМУ — на 45.000 руб., АСІПАВІЦКАМУ — на 50.000 руб. (у тым ліку 25.000 на будаўніцтва жылога дома), КРЫЧАЎСКАМУ — на 30.000 руб.

2. Абавязаць РВК паказаных раёнаў у дэкадны тэрмін правесці, у адпаведнасці з гэтай пастановай, скарачэнне выдаткаў па сваіх бюджэтах і паведаміць НКФінансаў, абгаварыўшы гэту пастанову на пасяджэннях прэзідыума РВК і сельсоветаў.

3. Адзначыць, што Совет Народных Камісараў прымушан быў прыняць такія меры ўздзеяння ў сувязі з выключна дрэннай работай РВК, советаў і фінансавых органаў па мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў гэтых раёнах.

4. Абавязаць НКФінансаў пры рашучым пераломе ў выкананні фінплана, пры сістэматычным выкананні заданняў пастаціць у другім паўгоддзі пытанне аб аднаўленні адпаведным раёнам зробленых скарачэнняў адлічэнняў у бюджэт.

5. Улічваючы сістэматычнае выкананне плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва з квартала ў квартал 1932 і 1933 г. г. і здавальняючае выкананне плана І квартала 1934 года, ПАВЯЛІЧЫЦЬ БЮДЖЭТ ПА ЖЫЛЛЁВАМУ БУДАЎНІЦТВУ ЧЫРВОНАСЛАБОДСКАМУ РВК НА 25.000 РУБЛЁЎ, СЛУЦКАМУ — НА 40.000 РУБЛЁЎ І АСВЕЙСКАМУ — НА 30.000 РУБ.

6. За непрыняцце належных мер да выканання фінплана, не гледзячы на катэгарычныя папярэджанні СНК, абвясціць суровую вымову старшыні Крупскага РВК тав. СКАРАХОДУ і Бягомльскага РВК тав. ШЭМПЕЛЮ.

Згадзіцца з прапановай НКФінансаў аб зняцці з работы за зрыў плана мабілізацыі сродкаў загадчыкаў райфа: Крычаўскага раёна т. ГАФТА, Чэрыкаўскага — т. ХІЛЬКЕВІЧА і Суражскага — т. МАНЮКА і скарыстанні іх на ніжэйшай фінансавай рабоце.

Прыняць да ведама паведамленне НКФінансаў аб тым, што ім за злачынна-нядбайную работу ў галіне выканання фінплана загадчык Крупскага райфа тав. МАЗАНІК і загадчык суражскай райашчадкасы т. ПІЛІПЕНКА зняты з работы і прыцягнуты да судовай адказнасці.

7. Абавязаць НКФінансаў, фінансава-крэдытныя органы на мясцах, райвыканкомы і советы пакрыць недабор І квартала па плану мабілізацыі сродкаў, забяспечыць сістэматычнае выкананне плана II квартала па ўсіх плацяжах насельніцтва і прадпрыемствах аграмаджанага сектара народнай гаспадаркі, а таксама прыняць рашучыя меры да ўзняцця работы ашчадкас. Папярэдзіць старшынь камсодаў; РВК і сельсоветаў, што яны нясуць персанальную адказнасць за становішча работы ашчадкас.

8. Лічыць недапушчальным прарыў плана мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў зборы ПАЯВЫХ НАКАПЛЕННЯЎ кааперацыі (квартальнае заданне на вёсцы выканана на 54 проц.), асабліва пры цяжкім фінансавым становішчы спажыўкааперацыі на вёсцы.

Абавязаць тав. БАСКІНА забяспечыць сістэматычнае выкананне плана паявых накапленняў кааперацыі, як важнейшага сродка ўзмацнення фінансавых рэсурсаў, неабходных для разгортвання таваразвароту па вясковай сетцы спажывецкай кааперацыі і ўзмацнення яе фінансавага становішча.

9. Абавязаць народнага камісара фінансаў тав. ХАЦКЕВІЧА ў залежнасці ад ходу выканання плана другога квартала своечасова падаваць у Совет Народных Камісараў БССР канкрэтныя прапановы аб дадатковых мерах фінансавага і адміністратыўнага ўздзеяння ў адносінах гарсоветаў, РВК і гаспадарчых арганізацый, якія не выконваюць фінпланаў, вызначаных на 1934 год.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

Кіраўнік спраў Совета Народных Камісараў БССР **С. ШАБОЛТАС.**

16 красавіка 1934 г.
г. Менск.

ПАЗЫКА ДРУГОГА ГОДА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

ДАЦЬ РАЁНАМ АБЛІГАЦЫІ

Рэалізацыя пазыкі сярод аднаасобнікаў праводзіцца за наяўны разлік. Аднаасобніку, які набывае пазыку, аблігацыі павінны выдавацца тут-жа на рукі. Але ў пераважнай большасці раёнаў да гэтага часу аблігацый няма. У рэзультаце рэалізацыя зрываецца.

Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР нічога не зрабіла каб паскорыць дасылку аблігацый раёнам. Больш таго, яно нават не лічыць абавязковым адказваць на шматлікія запытанні месц.

Так, з **Лепельскага раёна** ў кіраўніцтва паступіла 2 тэлеграмы аб высылцы аблігацый. Тры разы загадчык райашчадкасы патрабаваў па тэлефону. На ўсё гэта не паследвала адказу. Аблігацый у раёне няма і дагэтуль. Такое-ж становішча і па іншых раёнах.

Наркамфіну БССР трэба неадкладна заняцца гэтай справай і забяспечыць раёны аблігацыямі для рэалізацыі сярод аднаасобнікаў.

З ФРОНТА РЭАЛІЗАЦЫІ

УВАРАВІЧЫ. Рабочыя уваравіцкага вінзавода падпісаліся на пазыку на 10.345 руб.; рабочыя соўгаса «Уваравічы» на 12.380 руб.; соўгаса «Комунар» на 6.930 руб.

Разгарнулася падпіска і ў сельсоветах. .Па Рудзянецкаму сельсовету падпіска дасягнула 4.930 руб., Блюдніцкаму — 8.405 руб. Калгаснікі с.-г. арцелі «Чырвоны шлях», Бацунскага сельсовета, далі ў пазыку дзяржаве 3.970 руб., калгаса «1 мая» — 3.055 руб., «Вольная праца» — 2.000 руб.

Усяго па раёну з пачатку кампаніі рэалізавана пазыкі на 135.000 руб.

А. КАЗІМІРАЎ.

**

Правёўшы па-ўдарнаму падпіску на пазыку, гомельскі кандуктарскі рэзерв вылучыў брыгаду для дапамогі падшэфнаму калгасу «Чырвоны луг», Дуравіцкага сельсовета, Буда-Кашалеўскага раёна.

Брыгада выехала ў калгас, аднак там яна натыкнулася на перашкоду. Старшыня калгаса т. **ПАРХАНЕНКА** не толькі адмовіўся склікаць сход, але нават не дазволіў правесці гутарку з калгаснікамі аб значэнні пазыкі.

— Я не атрымаў ніякіх дырэктыў з раёна наконт гэтага, — заявіў старшыня калгаса.

Ніякія довады брыгады, спасыланні на дэкрэт урада, надрукаваны ў газетах, не дапамаглі.

Брыгада: **РУДАК, ЧЭРВЕНКА, СІЛІЦКІ.**

Падпіска прайшла з вялікім поспехам

ЖЛОБІН. Жлобінскае аддзяленне Заходніх чыгунак дабілася вялікіх поспехаў у рэалізацыі пазыкі. З 12.430 рабочых ахвачана падпіскай 12.406, 99,8 проц.). Рэалізавана аблігацый пазыкі на 1.357.875 руб.

Першымі закончылі падпіску Магілеўская дыстанцыя пуці і дэпо Асіпавічы.

Партыйныя, професіянальныя і гаспадарчыя арганізацыі пераключыліся на работу сярод неарганізаванага насельніцтва, хатніх гаспадынь, у падшэфных калгасах і вёсках.

ВАЛКІН, ГАРАДЫНЕЦ.

Кожны комуніст ведае ўчастак работы

Партыйная група калгаса імя Дзяржынскага (Ровіна-Слабодскі сельсовет зоны **Рэчыцкай МТС**) налічвае 5 чалавек. Група невялікая. Але правільна расставіўшы свае сілы, яна можа разгарнуць дзелавую работу.

Комуністы калгаса імя Дзяржынскага жывымі справамі паказалі гэта. Пад непасрэдным кіраўніцтвам палітаддзела МТС яны як след узяліся за перабудову сваёй работы, за прапрацоўку і ажыццяўленне рашэнняў XVII з'езда ВКП(б).

Як расстаўлены сілы партгрупы ў калгасе імя Дзяржынскага?

Парторг тав. **Малчанаў** да больш рашаючых участкаў прымацаваў усіх комуністаў. Тав. **Звяртоўскі Малах** прымацован да першай паляводчай брыгады, **Дворкін Іван**—да другой брыгады, Дворкін Адам—да чацвертай, **Дворкін Ігнат**—да пятай. Да астатніх брыгад прымацованы комсамольцы.

Тав. Малчанаў перад кожным з іх паставіў задачу—ў першую чаргу самім быць ударнікамі, на практычнай рабоце вучыць і падцягваць астатніх.

З гэтай задачай комуністы калгаса спраўляюцца. Комуніст **Дворкін Ігнат** паказаў лепшыя прыклады падрыхтоўкі да сяўбы. Ён сам вазіў гной, перавыконваючы нормы, увакодзіў у кожную дэталь калгаснай работы. Яго брыгада першай выйшла ў поле.

— Першымі і лепш за ўсіх правядзем сяўбу,—заяўляе Ігнат.

У гэтай брыгадзе добра пастаўлена работа з жанчынамі. Усе жанчыны абвясцілі сябе ўдарніцамі па правядзенню веснавой сяўбы. Па ініцыятыве жанчын у брыгадзе сабрана 230 руб. на пабудову чырвонага кутка. Праўленне адпусціла яшчэ 100 руб. У брыгадзе пачаў працаваць чырвоны куток. Закуплен патэфон, выпісана газет на 80 руб. Апрача таго Дворкін правёў работу сярод усіх калгаснікаў па выпісцы газет. Усе калгаснікі падпісаліся на газеты «Звязда», «Калгаснік Беларусі» і «Рэчыцкая праўда».

Парторг Малчанаў дае кожнаму комуністу канкрэтныя заданні. Заканчваецца прапрацоўка даклада тав. Сталіна. Даклад прапрацоўваецца і сярод аднаасобнікаў. У выніку—прыліў у калгас 18 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Брыгада лесарубаў пасля прапрацоўкі матэрыялаў з'езда абвясціла сябе ўдарнай і выканала заданне на 160 проц.

Апошні год даў па жывёлагадоўлі некаторы прырост: свіней штук, буйнай рагатай жывёлы 79, коней—23. Прапрацаваўшы даклад тав. Сталіна, жывёлагадоўчая брыгада абавязалася звесці адыход да нуля. У калгасе ўведзена здзельшчына—працадні налічваюцца па колькасці і якасці выдоенага малака, вырашчаных парсят, цялят і іх вазе. Даяркі і свінаркі такое рашэнне сустрэлі паляпшэннем догляду жывёлы. Даярка **Сівуха Хрысціна** чацверты год працуе на скотным двары. Працуе лепш за ўсіх. Зараз у яе 13 кароў. Ацялілася 7. Адыходу няма. Усе цяляты ў добрым стане. **У Ганчарэнкі Тацяны быў адыход**—прапала двое цялят. Партгрупа паставіла пытанне аб зняцці яе з работы на кароўніку.

Цяпер у калгасе адыходу няма. Вырошчваецца ўвесь маладняк.

Кожнаму комуністу, парторгам дано заданне—арганізаваць збор сродкаў на дапамогу аўстрыйскім рабочым. Сабралі 40 руб. Збор праводзілі жанчыны.

Партгрупа ўключылася ў дэкаднік ашчадсправы. Кожнаму комуністу Малчанаў даў канкрэтнае заданне. Комуністы на гэту справу мабілізавалі ўвесь актыў. У ашчадкасу ўцягнута 185 новых укладчыкаў, якія далі ўкладаў на 12 тысяч рублёў.

У пятай брыгадзе некаторыя калгаснікі марудна выконвалі план па мясапастаўках. Малчанаў даручыў комуністу Дворкіну Ігнату правесці масавую работу сярод калгаснікаў па гэтаму пытанню. За два дні заданне выканана на ўсе 100 проц.

Малчанаў правярае штодзенна, як выконваюцца заданні кожным комуністам.

Партгрупа калгаса імя Дзяржынскага ўзяла зусім правільны напрамак у сваёй рабоце. Яе прыкладу павінны следваць партгрупы іншых калгасаў.

Добрая работа партгрупы ў калгасе імя Дзяржынскага—перш за ўсё вынік таго, што палітаддзел МТС кіруе сваёй партарганізацыяй не наогул, а канкрэтна.

В. Стальноў.

На палітзаліках парткома Ветрынскай МТС

Да прапрацоўкі рашэнняў XVII партз'езда партком Ветрынскай МТС прыступіў тады, калі вышлі з друку матэрыялы з'езда.

Для кіраўніцтва занятками партком вылучыў тэарытычна падрыхтаванага члена партыі тав. **Мельнікава**.

Праз кожныя тры дні члены партыі, кандыдаты і беспартыйныя рабочыя МТС і ільназавода прапрацоўвалі рашэнні XVII партз'езда. Заўсёды на занятках прысутнічалі ўсе работнікі палітаддзела і работнікі МТС

Для праверкі, як комуністы і беспартыйныя ўсвядомілі даклад тав. Сталіна на днях былі праведзен палітзалікі. На палітзаліках прысутнічала 48 членаў партыі, кандыдатаў і беспартыйныя рабочыя, якія ўвесь час праходзілі вучобу ў партшколе.

Кіраўнік школы тав. Мельнік задае пытанне:

— Чым адрозніваецца сучасны эканамічны крызіс ад папярэдніх крызісаў у капіталістычных краінах.

Комуністы Ліцвінкоў і Грыгор'еў без усякіх замінак даюць ясны адказ на гэта пытанне, прыводзяць рад вытрымак з даклада тав. Сталіна, у якім ён растлумачвае адрозненне сучаснага крызіса ад папярэдніх.

Беспартыйнаму рабочаму Зайцаву задаецца пытанне:

— Чаму ў совецкай гаспадарцы не можа быць крызіса?

— У Совецкім Саюзе не можа быць крызіса таму, што наша гаспадарка будуецца па плану.

Зайцаў раней быў зусім палітычна непісьменны, а за час вучобы ў школе ён добра ўсвоіў даклад тав. Сталіна.

Без усялякіх замінак іншыя члены партыі, комсамольцы адказвалі на пастаўленыя пытанні.

Палітзалікі выявілі, што большасць комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных рабочых добра ўсвоілі даклад тав. Сталіна.

Н. НЕЙДЛІН.

адзін парторг не можа ў такіх умовах забяспечыць партработу ва ўсіх трох зменах.

На гэтым-жа камбінаце на 300 комуністаў ёсць 39 аслабанёных работнікаў, якія займаюцца партыйнай, профсаюзнай і комсамольскай работай. Аб фармальна правільнай перабудове сведчыць той факт, што на вячэрніх зменах няма партыйных кіраўнікоў, комуністы гэтых змен не ведалі, хто цэхпарторг. У гэтым цэху пяць рам, усяпяць самастойных працэсаў і ўсяго адзін парторг. Дзе-ж яму спраўціцца. Калі-б была праведзена правільная расстаноўка партыйных сіл і на кожнай раме быў-бы парторг, ён-бы арганізаваў партыйцаў і комсамольцаў, уваходзіў-бы сам у вытворчыя працэсы, падымаў-бы і ставіў пытанні, звязаныя з працай сам вытворчасці.

Вось чаму ЦК ВКП(б) указаў у сваім рашэнні ад 7 сакавіка, што трэба не механічна, не кампанейскі, а ўдумліва, выходзячы з умоў кожнага прадпрыемства, у парадку арганічнай работы праводзіць перабудову. Тут нельга ўсюды падыходзіць аднолькава. У адным выпадку не будзе зменных парторгаў, у другім выпадку зменныя парторгі могуць быць. Калі ёсць у цэху самастойныя працэсы вытворчасці, тут патрэбны групарторгі. Трэба выходзіць з канкрэтных умоў пры перабудове.

Вось яшчэ адзін прыклад. На віцебскай швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» ў бручным цэху працуе больш, чым у астатніх цэхах работніц, прышоўшых з вёскі. Тут-жа вялікая цякучасць. Зразумела, гэты цэх трэба было ўмацаваць моцнымі комуністамі, узяцца таксама за такое рашаючае звяно, як зарплата, падняць зацікаўленасць работніц у павышэнні сваёй кваліфікацыі, правільна перабудаваць сістэму зарплаты, весці адпаведную растлумачальную работу вакол пытанняў зарплаты. Між тым якраз гэтага і няма.

Бяда ў тым, што многія партработнікі мала вывучаюць тэхніку і змест партработы, а больш уваходзяць і ведаюць гаспадарчыя справы. Мы чулі на кустовай нарадзе ў Магілеве сакратара парткома фабрыкі штучнага валакна. І вось ён 40 мінут гаварыў. Калі-б мы не ведалі, што гэта сакратар парткома, стварылася-б думка, што гаворыць дырэктар, бо ён увесь час гаварыў аб гаспадарчай рабоце, а аб партрабоце нічога не сказаў.

Тав. **Кагановіч** гаварыў, што многія сельскія партработнікі добра ведаюць тэхніку сельска-гаспадарчай вытворчасці, але не ведаюць тэхнікі партработы. Тэхніка партработы—гэта самая складаная тэхніка, бо гэта тэхніка перапрацоўкі чалавека, выхавання новага соцыялістычнага чалавека. Таму кожнаму работніку, кожнаму парторгу трэба вывучыць гэту тэхніку, аўладаць ёю, займацца партработай.

Перабудова комсамола— кроўная справа партыі

Зараз аб партыйным кіраўніцтве комсамолам. Часта прыходзіцца сустракацца з наступнымі фактамі. Пытаешся: як у вас працуюць комсамольцы? Атрымліваеш адказ: дрэнна працуюць. А хто вінават, калі комсамольцы на тым ці іншым прадпрыемстве працуюць слаба? Тут трэба абвінавачваць у першую чаргу партыйцаў, бо на іх ляжыць абавязак выхоўваць комсамольцаў. Рад партыйных работнікаў яшчэ не разумеюць, што комсамол зараз вялікая сіла на вытворчасці. Комсамольцы цікавяцца трактарам, машынай, літаратурай, мастацтвам. З комсамольцаў вырастаюць энергічныя, выдатныя байцы соцыялістычнага будаўніцтва.

Да выхавання нашай маладой змены—комсамола павінны быць штодзённая ўвага і клопаты кожнай партыйнай арганізацыі, кожнага партыйнага кіраўніка. Характэрны прыклад. На Бабруйскай швейнай фабрыцы комсамольцы не наведвалі палітвучобу, аказалася, таму, што іх у школе не зацікавілі вучобай. А калі стварылі асобную комсамольскую школу, то яны і разам з імі беспартыйная моладзь добра пачалі наведваць заняткі.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што часта не ўмеюць зацікавіць вучобай комсомольцаў, а потым скардзяцца, што яны як быццам не хочуць займацца.

Камплектуюць школы часта вельмі вольна, так, што сюды ўваходзяць і комсамольцы і людзі старэйшага ўзросту. Безумоўна што заняткі ў такіх школах не могуць зацікавіць ні тых, ні другіх, бо розны ўзрост патрабуе дыферэнцыяванай пастаноўкі вучобы. Калі комсамолец уступае кандыдатам у партыю, яго адрываюць ад комсамольскай работы замест таго, каб пакінуць яго ў комсамоле з тым, каб ён праводзіў там работу.

Трэба зараз кожнай партыйнай арганізацыі звярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб комсамольцы былі ўзброены рашэннямі XVII партыйнага з'езда і выхоўваліся-б і ў школе, галоўным чынам, на практычнай рабоце. Трэба **дапамагчы комсамолу правільна правесці перабудову сваёй арганізацыі**, з тым, каб у рэзультаце гэтай перабудовы кожны комсамолец адчуваў-бы сябе па вытворчасці як баявы памочнік партыі.

З усяго гэтага вынікае, што асноўнае ў перабудове партработы— гэта работа з кожным членам партыі і ў сваю чаргу, каб праз члена партыі ахапіць партыйным уплывам і комсамол, і беспартыйныя масы рабочых. Таму трэба так пабудаваць пярвічную партарганізацыю, каб кожны комуніст працаваў з групай беспартыйных рабочых.

Многія пытаюцца, хто будзе працаваць з работніцамі, жонкамі рабочых, ці патрэбны жаноргі? У гэтых адносінах багацейшы вопыт ёсць у маскоўскіх партыйных арганізацыях, якія будуюць сваю партработу іменна так, каб кожны партыец ахапляў большэвіцкім уплывам беспартыйныя масы рабочых.

Вось, напрыклад, прапрацоўка ў рабочай сям'і даклада тав. **Сталіна**. Тут не патрэбен спецыяльны прапагандыст, а трэба, каб кожны член партыі добра вывучыў гэты даклад і рашэнні з'езда, каб ён змог растлумачыць гэта другім. Кожны член партыі павінен быць прапагандыстам. бо хто не прапагандуе тэорыю Маркса—Леніна—Сталіна, той не комуніст. Трэба умець так пабудаваць прапаганду, каб паказаць ролю дадзенага чалавека ў нашым соцыялістычным будаўніцтве і на малых справах паказаць усю веліч нашага будаўніцтва. Вытворчыя сілы без палітычных ведаў не могуць мець каштоўнасці.

Многія парторгі могуць сказаць: «Вось мы добра паставілі вучобу», але калі промфінплан на вытворчасці не выканан, нічога не варта такая вучоба». Уся справа іменна ў тым, каб так перабудаваць партработу, каб гэта перабудова і вучоба спрыялі-б выкананню промфінплана і па колькасных і па якасных паказальніках.

**

Вельмі важным пытаннем з'яўляецца падрыхтоўка **партыйных сходаў**. Ні адзін партком не займаецца як след зместам партдня, падрыхтоўкай яго і падвядзеннем вынікаў. Між тым партыйны сход павінен адыграць вялікае значэнне ў справе партыйнага выхавання кожнага члена і кандыдата партыі.

Возьмем такое пытанне, як норма выпрацоўкі. Мы маем вакол гэтага пытання часта нездаровыя настроі з боку больш адсталых рабочых. Чаму-б не падрыхтаваць партыйны сход, прысвечаны гэтаму пытанню, якое прайшло-б з сапраўдным вытворчым і палітычным эфектам. У рэзультаце такога схода партыец і прысутныя беспартыйныя рабочыя на многа-б выраслі. Вось іменна ў гэтым і выражаецца змест партыйнай работы.

Партыйную работу— у цэнтр увагі інструктара

Некалькі слоў пра **інструктара гаркома**. Яго роля безумоўна вялікая. Ён павінен прыйсці на вытворчасць, пазнаць настрой, чым жыве рабочы, дапамагчы парткому, парторгу цэха, групарторгу ўцягнуць кожнага рабочага ў барацьбу за выкананне палітычных задач, пастаўленых партыяй у барацьбе за промфінплан.

Няправільным з'яўляецца такое становішча, калі многія інструктары адчуваюць сябе на правах падрайкомаў. **Інструктар—гэта звязваючае звяно пярвічнай партарганізацыі з гаркомам партыі.** Інструктар—гэта дынамічнае звязваючае звяно сакратара парткома або райкома з пярвічнай партарганізацыяй. Сакратар павінен так наладзіць сувязь праз інструктароў, каб ён быў у курсе жыцця пярвічнай партарганізацыі.

Не можа быць перабудавана работа гаркома, калі сам інструктар адарван ад бюро парткома або пленума. Той райком, той гарком, які не разглядае інструктара як дынамічна звязваючага арганізатара партработы пярвічнай партарганізацыі з гаркомам будзе займацца голым адміністраваннем, вымовамі і інш.

Пытанне **разгортвання** большэвіцкай самакрытыкі ў справе перабудовы партыйнай работы адыгрывае рашаючую ролю. Іменна больш дзелавой самакрытыкі, дапамагаючай члену партыі выпраўляць свае недахопы. Калі мы пры прапрацоўцы матэрыялаў XVII з'езда тут-жа выявілі, раскрытыкавалі нашы недахопы, старыя метады і формы работы і гэта дапамагло выправіць недахопы—вось гэта і будзе сапраўды большэвіцкая самакрытыка. **Без гэтай жорсткай, дзейснай большэвіцкай самакрытыкі немагчыма сапраўдная перабудова.**

Аб уліку. Ці патрэбен план і як весці ўлік работы? Трэба, безумоўна, планаваць работу і весці ўлік. Трэба таксама даваць заданні парторгам, але каб не атрымалася так, што парторг усю сваю ўвагу, сілы і час расходуе на планы,-дзеннікі за кошт работы з жывым чалавекам, з комуністам і беспартыйным рабочым. Не трэба захапляцца празмерна планамі, вялікімі дзеннікамі, бо калі кожнаму парторгу пісаць доўгія планы і весці дзеннікі, у яго не астанецца часу для работы.

**

Тэхніка партыйнай работы надзвычай тонкая, бо тут ідзе гутарка аб жывым чалавеку, аб яго здольнасцях і нахілах. Толькі глыбокае вывучэнне ўсіх асаблівасцяй і дэталяй партыйнай работы дасць магчымасць партыйным кіраўнікам аўладаць гэтай тэхнікай і забяспечыць сапраўды большэвіцкую перабудову.

ШКОЛ… НА П… (Ад… ДУБРОЎН… праходзіць… сістэматычна… жывёлу на… Вось харак… ра, былога… пралез у ан… загатоўшчы… шыні Гарп… Новікава,… шэння… 17.642… Пад… ларка… мерп…

СПАНІЯ Ў АГНІ СТАЧАК

ПАРЫЖ, 22 красавіка. (БЕЛТА).

Паводле паведамлення з Мадрыда па заклiку кампартыі іспанскія прафсаюзныя арганізацыі рашылі правесці 23 красавіка ўсеагульную забастоўку пратэсту супроць дэманстрацыі фашыстаў у Мадрыдзе. Сёння было прынята над націскам мас наперакор варожым адносінам кіраўнікоў сацыялістаў і Гарпарха-сіндыкалістаў к стварэнню адзінага фронта рэвалюцыйнай барацьбы. Мадрыдскія рабочыя пачалі забастоўку ўночы з 21 на 22 красавіка.

Рабочыя спынялі і перакідалі грузавікі, на якіх фашысты накіроўваліся ў Мадрыд для ўдзелу ў сваёй дэманстрацыі. Чыгуначнікі спынялі на многіх вакзалах паязды, з якімі фашысты праязджалі ў Мадрыд. Усё гэта рабілася не гледзячы на тое, што фашыстаў ахоўвалі буйныя паліцэйскія сілы.

У рэзультаце ў фашысцкай дэманстрацыі ў Мадрыдзе прыняло ўдзел не 50 тыс., як разлічвалі фашысты, але 20 тыс. фашыстаў. Перад дэманстрантамі выступіў Роблес, заявіўшы, што фашысцкая арганізацыя «народнае дзеянне» («Аксіон пануляр») гатова к вулічным баям.

Паралельна з антыфашысцкай барацьбой прадаўжаюцца эканамічныя стачкі. У Мадрыдзе прадаўжаецца забастоўка металістаў. У Сарагосе ўсеагульная забастоўка. У Валенсіі ўсе прафсаюзы рашылі пачаць сёння ўсеагульную стачку салідарнасці з бастуючымі камунальнымі рабочымі.

**

ЛОНДАН, 22 красавіка. (БЕЛТА).

Мадрыдскі карэспандэнт «Таймс» паведамляе, што ўчарашняя забастоўка ў Мадрыдзе супроць правакацыі фашыстаў была сапраўды ўсеагульнай. У ёй прымалі ўдзел усе рабочыя. Забастоўкі былі таксама праведзены ў Більбао, Толедо і Оренсе. У Аранжуэцы адбыліся сутычкі паміж фашыстамі і рабочымі. Грамадзянская гвардыя адкрыла агонь. Забіта многа рабочых. У Саламанцы, Аліканце і іншых гарадах адбыліся антыфашысцкія дэманстрацыі.

Як паведамляе Рэйтэр, у Мадрыдзе арыштавана 120 антыфашыстаў.

БАРТУ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 23 красавіка (БЕЛТА).

Польскае агенцтва паведамляе: «Міністр замежных спраў Бек даў у гонар Барту абед, на якім прысутнічалі сярод іншых віцэ-міністр Шэмбек, французскі пасол Ларош, міністр фінансаў Завадскі і старшыні соймавай і сенацкай камісій па замежных справах. Бек сказаў прамову, у якой вітаў міністра Францыі, прыяцельскай саюзнай краіны. З адказнай прывітальнай прамовай выступіў Барту.

У заключэнне Барту абвясціў тост за здароўе прэзідэнта Масціцкага, за Бека і яго жонку, за вечнае працвітанне польскага народу. Пасля абеда ў кватэры Бека адбыўся прыём, на якім прысутнічалі ўсе выбраныя прадстаўнікі палітычнага, дыпламатычнага свету і прадстаўнікі інтэлігенцыі.

**

ВАРШАВА, 23 красавіка (БЕЛТА).

Барту аказан надзвычай сардэчны прыём. Сёння раніцой Барту прыняў прадстаўнікоў польскага і замежнага друку. Ён падкрэсліў міралюбівыя імкненні Францыі, рэзка выказаўся супроць спроб ператварыць разззбраенне ў даўзбраенне і рашуча падкрэсліў моцнасць польска-французскага саюза. У заключэнне Барту падкрэсліў, што Польшча ўмацавалася і стала вялікай дзяржавай і што нікога не могуць здзіўляць тыя ці іншыя самастойныя меры Польшчы ў мэтах умацавання міру.

У палітколах звярнулі ўвагу на жартлівую заўвагу Барту, што ён пакуль меў у Варшаве прыемныя гутаркі, але не карысныя. Сёння Барту будзе гаварыць з Пілсудскім. Заўтра Барту ад'язджае ў Прагу і па дарозе спыніцца ў Кракаве. Да Кракава Барту будзе суправаджаць Бек.

СТАНОВІШЧА Ў СІНЦЗЯНЕ

АХТЫ, 20 красавіка. (БЕЛТА).

17 красавіка ва Ўрумчы адбылося адкрыццё агульна-правінцыяльнай нарады нацыянальнасцей Сінцзяна, скліканай правінцыяльным урадам.

На нараду з'ехаліся дэлегацыі ад усіх акруг і раёнаў, вызваленых ад дунганскіх банд. Усяго ў Урумчы прыбыла звыш 200 дэлегатаў. Нарада была адкрыта ва ўрачыстай абстаноўцы. Старшыня ўрада Лі Юнь у вялікай прамове намеціў шляхі змацавання міру ў правінцыі і яе эканамічнага і культурнага развіцця.

Дубань Шэн Шы-цай у сваім выступленні падкрэсліў, што ў гадавіну фармавання новага ўрада, супадаючую з адкрыццём нарады, можна канстатаваць устанаўленне моцнага міру ў асноўнай частцы правінцыі, і выказаў упэўненасць, што ў бліжэйшы час правінцыяльныя войскі поўнасцю ліквідуюць астаткі атрадаў уцёкшага на поўдзень Ма Чжу-іна і паўднёвы «незалежны ўрад», які імкнецца адарваць Сінцзян ад Кітая.

Дубань адзначыў цвёрдую рашучасць правінцыяльнага ўрада ажыццёвіць праграму забеспячэння роўнапраўя ўсіх нацыянальнасцей Сінцзяна, свабоды рэлігій, эканамічнага і культурнага развіцця правінцыі.

Дэлегаты, выступіўшыя на нарадзе, агаласілі прывезеныя імі наказы розных акруг, у якіх пералічваюцца іх патрэбы. Наказы змяшчаюць прапановы аб арганізацыі кіраўніцтва правінцыі з улікам нацыянальных адносін, аб урэгуляванні зямельных спрэчак, аб будаўніцтве школ і бальніц, разгортванні культурнай работы, развіцці мясцовай прамысловасці і гандлю, аб дарожным будаўніцтве, аб урадавай дапамозе насельніцтву, разоранаму бандытамі.

Нарада праходзіць з вялікім уздымам, пад знакам аднадушнай гатоўнасці ўсіх нацыянальнасцей актыўна супрацоўнічаць з правінцыяльным урадам і аказваць яму цвёрдае падтрыманне. На нарадзе прысутнічае таксама шматлікая дэлегацыя мірнага дунганства.

ЗША І ЯПОНСКАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ

НЬЮ-ЁРК, 22 красавіка (БЕЛТА).

«Нью-ёрк таймс» указвае, што апошняя японская дэкларацыя «датычыць перш за ўсё ЗША», бо Вашынгтон адыгрываў галоўную ролю ў крытыцы японскай палітыкі, узяў на сябе ініцыятыву ў агалашэнні непрызнання тэрытарыяльных змен, выкліканых узброеннем сілы, і даўно настойвае на прынцыпе «адкрытых дзвярэй», які палітыка Японіі ўжо ставіць пад пагрозу. Далей ЗША прадаставілі пазыку Кітаю, і цяпер амерыканцы абучаюць кітайскіх лётчыкаў.

«Быць можа, — піша далей газета», — захват Манчжурыі, адпраўка войск у Шанхай два гады назад складалі частку той палітыкі, якую зараз агаласіў Токіо. Але другія дзяржавы не былі аб гэтым паведамлены. Вось чаму з боку дзяржаў было-б разумна прапанаваць Токіо, каб ён даў ім магчымасць даведацца, што якраз тоіць у сабе японская палітыка ў Кітаі. Можа здарыцца, што ў далейшым Японія захваціць Бэйпін і Цяньцзін і заявіць, што гэтыя дзеянні з'яўляюцца часткай старадаўняй палітыкі».

Газета ўказвае, што калі Японія не дасць здавальняючых запэўненняў аб сваёй палітыцы ў адносінах Кітая, то другія дзяржавы пачнуць верыць у сапраўднасць мемарандума Танака.

«Вашынгтон пост» у сваю чаргу піша, што японская заява асабліва датычыць ЗША, якія ў сілу неабходнасці разлічваюць на лаяльнасць Японіі для захавання міру на Ціхім акіяне». Газета выказвае ўпэўненасць, што міністэрства замежных спраў ЗША ўжо прадпрымае меры, каб справіцца з першым буйным дыпламатычным іспытам, з якім прыйшлося сустрэцца ўраду Рузвельта.

ПОЛЬСКІЯ ФАШЫСТЫ

ВАРШАВА, 23 красавіка (БЕЛТА).

Гэтымі днямі газета «АБЦ» змясціла адозву нова-створанай арганізацыі, назваўшай сябе «Нацыянальна-радыкальны лагер». Сярод падпісаўшыхся рад былых легіянераў. Змест адозвы сведчыць, што «нацыянальна - радыкальны лагер»— арганізацыя наскрозь фашысцкая.

Тыпова фашысцкай з'яўляецца сацыяльная дэмагогія, ігра на беднасці і галечы мас, зоалагічны нацыяналізм і інш.

Новая арганізацыя патрабуе больш актыўнай паланізатарскай дзейнасці як у самой Польшчы, так і на яе крэсах (акраінах)—у Заходняй Беларусі, заходняй Украіне, у Віленскай вобласці і інш.

Польская дзяржава, — гаворыцца далей у адозве,—павінна быць «ваеннай арганізацыяй польскага народу, а служба ў арміі—важнейшым інструментам нацыянальнага выхавання».

Дзяржава павінна быць даручана толькі «носьбітам польскай цывілізацыі», гэта значыць прадстаўнікам крайняга польскага нацыяналізма. Характэрна, што новая фашысцкая арганізацыя, улічваючы велізарную ўдзельную вагу нацыянальных меншасцей у Польшчы, намячае праграму супрацоўніцтва з верхавіннымі буржуазна-капіталістычнымі слаямі нацыянальных меншасцей, абяцаючы ім (украінскай і беларускай буржуазіі) поўныя грамадзянскія правы. Яўрэйскае-ж насельніцтва вылучаецца ў групу грамадзян другога разраду.

Арыентуючыся на моцнага кулака, фашысцкі «нацыянал-радыкальны лагер» высоўвае праект парцэляцыі буйных землеўладанняў і размеркавання іх «у першую чаргу сярод польскіх сялян», гэта значыць галоўным чынам сярод членаў розных ваенна-фашысцкіх арганізацый і іх прыхільнікаў.

Аўтары адозвы заклікаюць пад свае сцягі «польскую моладзь для барацьбы за стварэнне вялікай Польшчы». Новая група выдае штотыднёвік «Стафета».

ПА СССР

ТУРЭЦКАЯ ВАЕННАЯ ЭСКАДРЫЛЬЯ Ў МАСКВЕ

МАСКВА, 23 красавіка (БЕЛТА).

23 красавіка ў Маскву прыляцела турэцкая ваенная эскадрылья ў складзе 5 самалётаў. Пакрыта каля 1.500 клм. паветранага шляху. Пагода спрыяла палёту, праходзіўшаму выключна арганізавана і ўдачна.

У маскоўскім аэрапорце гасцей сустрэлі нач. ваенна-паветраных сіл Чырвонай арміі т. Алкснiс, пам. начальніка ВВС т. Ткачоў, турэцкі пасол Рагіп-бей, прадстаўнікі Наркамваенмора, НКЗС, чыны турэцкага пасольства ў Маскве, прадстаўнікі савецкага і замежнага друку і інш. Турэцкія госці прымалі парад ганаровай варты. Аркестр іграў турэцкі нацыянальны гімн і «Інтэрнацыянал».

ТАНК-ПАРАВОЗЫ

ЛЕНІНГРАД, 22 красавіка. (БЕЛТА).

Неўскі завод імя Леніна з поспехам асвойвае вытворчасць танк-паравозаў. У красавіку ён выпускае 10 укамплектаваных танк-паравозаў, у маі — 13, у чэрвені — 14. Зараз вядуцца работы над выпускам танк-паравоза новага цяжкага тыпа, які прызначаецца для абслугоўвання мартэнаў. Першыя два такія паравозы будуць выпушчаны ў жніўні.

СССР СТВАРЫЎ УЛАСНУЮ АЛЮМІНІЕВУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

МАСКВА, 22 красавіка. (БЕЛТА).

СССР стварыў уласную магутную алюмініевую прамысловасць. У гэтым годзе вытворчасць алюмінія павялічваецца параўнальна з мінулым годам у 3,5 разы. Ужо ў гэтым годзе краіна амаль поўнасцю вызваліцца ад імпарту алюмінія. Ствараецца магутная тэхнічная база гэтай новай прамысловасці. У 1934 г. будуць пушчаны ўсе часткі Волхаўскага камбіната і першая чарга Дняпроўскага камбіната. У адрозненне ад папярэдніх год алюміній будзе вырабляцца амаль цалкам з савецкіх матэрыялаў.

ЧОРНАМОРСКАЯ НАФТА

НОВАРАСІЙСК, 23 красавіка. (БЕЛТА).

Разгортваюцца работы па эксплаатацыі чорнаморскіх месцараджэнняў нафты. У гэтым годзе чорнаморскія промыслы дадуць 20 тыс. тон нафты. Здабыча нафты ўжо ідзе на асобных скважынах.

6500 ТОН ЭЛЕКТРОДАЎ ЗА ГОД

ЧЭЛЯБІНСК, 23 красавіка (БЕЛТА).

Закончана будаўніцтва Чэлябінскага электроднага завода. Галоўная магутнасць яго 6.500 тон электродаў. Завод у першую чаргу забяспечыць электродамі чэлябінскія ферасплаўны і абразіўны заводы.

МАГУТНЫ РУДНЫ КАМБІНАТ

ПЯЦІГОРСК, 23 красавіка (БЕЛТА).

У Кабардзіна-Балкарыі пачалося будаўніцтва Малкінскага руднага камбіната. Камбінат будзе даваць штогод 500 тыс. тон высокаякаснай жалеза-хромава-нікелевай руды.

Планер падняўся...

На планердроме 24 красавіка адбылася першая авіяпланерная масоўка, арганізаваная ЦС Асоавіяхіма БССР і менгаркомам камсамола.

...Шырокія крыллі планера здалёк блішчэлі на сонцы. Жоўтая кабінка прыцягвала да сябе ўвагу ўсіх удзельнікаў масоўкі.

На старце — пілот-інструктар рэспубліканскай планернай школы т. Орэшкін.

Усе на месцах. Падрыхтоўка скончана.

— Гатова,—раздаецца гучны голас з кабінкі.

Планер лёгка слізгае па зямлі і адразу лёгкім рыўком узнімаецца ў паветра.

Роўнамерна набірае вышыню Орэшкін. Аднак сілай ветранага парыву планер адносіць у бок і прымушае пілота праз некалькі мінут пайсці на пасадку. Выбраўшы роўную пляцоўку, Орэшкін павольна спускаецца на зямлю.

Тав. Орэшкін з'яўляецца адным з лепшых пілотаў-планерыстаў БССР. 23 красавіка напярэдадні масоўкі пры пробным палёце тав. Орэшкін пратрымаўся ў паветры 19 мінут 50 секунд.

За Орэшкіным падніміліся ў паветра пілоты-планерысты Бухарэўскі, Шварц і інш. З-за моцнага ветра кожны з іх пратрымаўся ў паветры не больш 5-6 мінут.

Аднак, гэта не першае маладых планерыстаў. Галоўнае—пачатак зроблен.

У часе перапынку начальнік авіяцыйнага аддзела Цэнтральнага совета Асоавіяхіма тав. Сакалоўскі растлумачыў удзельнікам масоўкі пабудову планера і правёў гутарку аб задачах планернага спорта.

— Масавы планерны спорт, — сказаў т. Сакалоўскі—выхавае сотні новых лётчыкаў—будучых герояў Совецкага Саюза.

У першай масоўцы прымалі ўдзел рабочая моладзь школьнікі-авіямадэлісты.

На масоўцы былі старшыня ЦС АСО БССР тав. Дубіна, начальнік баявой падрыхтоўкі тав. Кузняцоў, старшыня горсавета тав. Жуковіч і іншыя.

ТУР.

НАСУСТРАЧ 1-му МАЯ

* На менскай гарбарні «Бальшэвік» абвешчана пераклічка зотаўцаў і збор рацыяналізатарскіх прапаноў у фонд імя 1-га мая.

Разгортваецца абследаванне кватэр рабочых. На кватэрах ударнікаў устаноўлены 50 радыёпрыёмнікаў і зроблена 25 электраўводаў. 1-га мая адбудзецца выпуск заводскай школы па ліквідацыі малапісьменнасці.

* У азнаку 1-га мая на торфазаводах адкрываюцца новыя культурна-бытавыя ўстановы. На заводзе «Шлях сацыялізма» адкрываецца дзіцячы сад. На торфазаводзе «Бальшэвік» будуць адкрыты новыя яслі на 30 дзяцей і сталоўка. На торфазаводзе імя Гея — новы клуб.

* Белкаапсаюз адпусціў вядучым прадпрыемствам 50 тон свініны і 6.000 кур і 115 тон кандзіцерскіх вырабаў.

* У менскім клубе друкароў адбыўся злёт значкістаў «ЗОТ», у якім прымала ўдзел 110 чалавек. Да 1 мая ў клубе арганізуецца вітрына лепшых ударнікаў і «выдатнікаў»-зотаўцаў.

* Дрэваапрацоўчы завод «Комінтэрн» у Барысаве выпускае к святу 50 паказальных дзіцячых веласіпедаў.

* Наркамасветы Беларусі выдзяляе 15 мастацкіх брыгад для абслугоўвання дэманстрацыі. 2 мая — на плошчы Волі вялікі інтэрнацыянальны канцэрт з удзелам лепшых мастацкіх сіл горада.

„ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ“ ВЫПУСКАЕ НОВЫЯ ВАРШТАТЫ

КРАСАВІЦКІ ПРОМФІНПЛАН ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА

ВІЦЕБСК, 24 красавіка. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

На заводзе «Чырвоны металіст» ідзе асваенне выпуску новага варштата «Ціль» (разьба-нарэзны) і варштата «Гарбнер» (шліфавальны). Ужо гатовы чарцяжы.

Гэтыя варштаты да апошняга часу паступалі толькі з-за граніцы і завод упершыню бярэцца за іх асваенне.

Завод «Чырвоны металіст» 23 красавіка ў 12 гадзін дня датэрмінова выканаў красавіцкі промфінплан на 100,3 проц., выпусціўшы прадукцыі на 492.400 руб.

Цэх шырспажыву завода «Комінтэрн» рыхтуе к 1 мая 100 дзіцячых веласіпедаў, на якіх дзеці рабочых завода будуць выязджаць на першамайскую дэманстрацыю.

На акулярнай фабрыцы разгорнут конкурс на лепшы цэх і брыгаду, якія к 1 маю прыдуць з высокімі паказальнікамі па выкананню промфінплана. Перадавому цэху вызначана прэмія: пераходны чырвоны сцяг і 500 руб.; перадавой брыгадзе — бюст Сталіна і 200 руб. На гэтай фабрыцы рабочымі арганізован рабочы струнны аркестр, які прыме ўдзел у першамайскай дэманстрацыі.

У калгасе «Чырвоная армія» ў брыгадзе № 1 на скотны двор праводзіцца электрычнасць.

28 КРАСАВІКА—УСЕБЕЛАРУСКАЯ РАДЫЁНАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЕТ І РАБСЕЛЬКОРАЎ

Аддзел культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б і палітсектар НКЗ БССР разам з рэдакцыяй журнала «Бальшэвіцкі друк» 28 красавіка ў 7 гадзін 45 мінут вечара праводзяць усебеларускую радыёнараду рэдактароў раённых і палітаддзельскіх газет з удзелам рабселькораў і рэдактароў насценгазет калгасаў, саўгасаў і МТС па пытаннях веснавой сяўбы, прапаганды рашэнняў XVII з'езда ВКП(б) і падрыхтоўкі да дня друку.

Прапануецца рэдактарам раённых і палітаддзельскіх газет падрыхтавацца да дакладаў з разлікам на 5 мінут. Арганізуйце калектыўнае слуханне радыёнарады рабселькорамі і рэдактарамі насценгазет.

Загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б КОНІК.

АДКРЫЎСЯ ПЛЕНУМ ОРГКАМІТЭТА САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Вечарам 23 красавіка ў вялікай зале Дома Партактыва адкрыўся другі пашыраны пленум аргкамітэта саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Пленум адкрыў АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ.

У прэзідыуме — народныя паэты рэспублікі ЯНКА КУПАЛА і ЯКУБ КОЛАС, загадчык аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)Б тав. КОНІК, сакратар аргкамітэта ССПБ тав. БРАНШТЭЙН, пісьменнікі ЧАРОТ, КУЛЬБАК, КРАПІВА, т.т. БРАГІНСКІ, ЖАРСКІ, БЕР.

— Два гады, якія прайшлі з часу апублікавання гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый, — зазначыў ва ўступнай прамове тав. АЛЕКСАНДРОВІЧ, — далі рад вялікіх твораў, актуальных па сваёй тэматыцы, поўнакроўных, сапраўды мастацкіх. Пастанова ЦК з'явілася новым стымулам для росту і росквіту совецкай літаратуры Саюза, і ў прыватнасці БССР.

Пастанова ЦК пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый нанесла сакрушальны ўдар па групаўшчыне ў нашых пісьменніцкіх радах, па беспрынцыпнай сварцы, па зажыму бальшэвіцкай самакрытыкі. Зараз, са стварэннем адзінага саюза совецкіх пісьменнікаў, мы маем усе ўмовы для напісання твораў, вартых вялікай эпохі Сталіна!

З дакладам на тэму аб другой гадавіне пастановы ЦК і задачах беларускай совецкай літаратуры выступіў старшыня аргкамітэта ССПБ МІХ. КЛІМКОВІЧ.

Ён падрабязна спыніўся на вялікім палітычным значэнні пастановы ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 г., падкрэсліўшы, што пастанова дала магутны штуршок для напісання новых буйных палотнаў, якія адлюстроўваюць самыя разнастайныя ўчасткі сацыялістычнага будаўніцтва. Тав. Клімковіч пералічвае такія буйныя творы совецкай літаратуры БССР, як «Над ракой Арэсай» Я. Купалы, «Мядзведзічы» К. Крапівы, «Вязьмо» М. Зарэцкага, «На чырвоных лядах» М. Лынькова, «Дрыгва» Я. Коласа.

Тав. Клімковіч асабліва спыняецца на дыскусіі, узнятай у сувязі з вядомымі артыкуламі А. М. Горкага аб мове пісьменніка.

— Пытанне мовы, як галоўнейшага сродку, якім аперуе ў сваёй дзейнасці пісьменнік, з'яўляецца пытаннем не толькі формы, але і галоўнейшым пытаннем барацьбы за ідэалагічную якасць любога мастацкага твора. Недарма Аляксей Максімавіч з усёй сілай б'е па незразумеласці, архаічнасці, па наўдалых неалагізмах і проста «блатных» словах.

У сваім дакладзе тав. Клімковіч спыняецца на канкрэтных прыкладах досыць нядбайных адносін да гэтага важнейшага ўчастка многіх беларускіх совецкіх пісьменнікаў (Ул. Хадыка, М. Хведаровіч, Ю. Віцьбіч і інш.).

— Нават у нашых вядучых паэтаў і пісьменнікаў назіраюцца моманты абываякавых адносін да слоўнага матэрыялу да мовы. На гэты ўчастак нашы літаратурныя работнікі, як зусім правільна зазначае тав. Горкі, павінны звярнуць зараз выключную ўвагу!

Побач з пытаннямі мовы пісьменнікаў дакладчык аналізуе іх тэматыку, зазначае рад твораў, якія адлюстроўваюць велізарныя зрухі ў нашай краіне, працэс калектывізацыі, сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасці, транспарту і г. д. З твораў, якія сапраўды становяцца ў першыя рады совецкай літаратуры БССР, тав. Клімковіч называе «Бацькаўшчыну» К. Чорнага, «Канец дружбы» К. Крапівы, «Хлебную зіму» і «Незапомную восень» А. Александровіча, рад новых твораў П. Броўкі, П. Глебкі, М. Лынькова, П. Галавача.

Асобна спыняецца тав. Клімковіч на творах маладых пісьменнікаў, якія прыйшлі ў літаратуру пасля вынясення гістарычнай пастановы ЦК: «Тэорыя Капенбрун» Э. Самуйлёнка, «Сонца пад шпалы» Хв. Шынклера, «Біяграфія майго героя» С. Знаёмага.

Заканчваючы свой даклад, тав. Клімковіч выражае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што пакончыўшы з астаткамі групаўшчыны ў сваім асяроддзі, актыўна ўключыўшыся ў сацыялістычнае будаўніцтва, глыбока ўваходзячы ў практыку пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, совецкія пісьменнікі БССР дадуць рад новых буйнейшых поўнацэнных твораў, вартых нашай непараўнальнай эпохі.

З прамовай, прысвечанай другой гадавіне пастановы ЦК, выступіў тав. Крапіва. Андрэй Александровіч прачытаў урывак з сваёй паэмы «Пагранічная вясна». Тав. Кульбак прачытаў урывак з сваёй новай рэчы «Чайльд-Гарольд з Дзісны».

Спатканы бурнымі апладысментамі народны паэт Янка Купала прачытаў урывак з сваёй славутай паэмы «Над ракой Арэсай». Народны паэт Якуб Колас прачытаў верш, прысвечаны геранчным удзельнікам паходу «Челюскина».

З чыткай сваіх твораў выступіў таксама польскі совецкі паэт В. КАВАЛЬСКІ і яўрэйская паэтэса з Украіны ЛЕВІНА.

Учора раніцай пленум заслухаў даклад тав. АЛЕКСАНДРОВІЧА аб выніках апошняга пленума Усесаюзнага аргкамітэта ССП.

Юр. Л—ны.

ПРАЦЭС ЗАБОЙЦАЎ АКТЫВІСТА-ЧЫГУНАЧНІКА тав. ЧЭПІКАВА

ЗАБОЙЦА АРХІПАЎ ПРЫСУДЖАН ДА ВЫШЭЙШАЙ МЕРЫ СОЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ

ВІЦЕБСК. (Па тэлеф. ад кар. «Звязды»).

Выязная сесія лінейнага суда пад старшынствам тав. Куткова пры засядацелях — т. ПАТАПАВЕ (машыніст паравознага дэпо) і т. ПАШКО (загадчык манеўрамі ст. Віцебск) з удзелам дзяржаўнага абвінаваўцы—лінейнага пракурора т. РЫЎКІНА і грамадскага абвінаваўцы т. ЖУКАВА закончыла слуханне справы АРХІПАВА і ІЛЬІНА, абвінавачаных у забойстве актывіста, грамадскага работніка, загадчыка манеўрамі тав. ЧЭПІКАВА. (Гл. «Звязду» за 18-IV).

На судзе выявілася, што Павел Архіпаў у мінулым заядлы п'яніца, хуліган, некальні раз за хуліганства судзіўся. Пасля апытання сведак і самых абвінавачаных суду стала ясна, што Архіпаў разам з Ільіным даўно рыхтавалі расправу над тав. Чэпікавым з мэтай адпомсціць яму як лепшаму ўдарніку. Выканаўцам з'яўляўся Архіпаў.

Ільін граў ролю падбухторшчыка.

Сведка КОМЕЛЬ—начальнік станцыі Віцебск, расказаў, што Архіпаў з'яўляўся адным з дрэнных рабочых на транспарце. «Ён,—гаворыць сведка, — АДЗІН З НЕДЫСЦЫПЛІНАВАНЫХ РАБОЧЫХ, ДЭЗАРГАНІЗАТАР». Таксама высветлілася, што Архіпаў, працуючы раней на таварным двары, атрымліваў ад кліентуры хабары. У той-жа час тав. Комель прыводзіць прыклады актыўнай дапамогі, якую аказваў транспартным арганізацыям тав. Чэпікаў у выяўленні дэзарганізатараў транспарта. Тав. Чэпікаў выявіў такіх дэзарганізатараў транспарта як ЖЫЗНЕЎСКІ, СЕМЯНОЎСКІ і інш.

Далей тав. Комель спыняецца на абставінах забойства тав. Чэпікава. Ён прыводзіць вывады тэхнічнай камісіі аб тым, што Чэпікаў выпадкова не мог трапіць пад паравоз. Зусім ясна, што гэта справа Архіпава і Ільіна, якіх тав. Чэпікаў выкрыў пры кражы спірту.

Усяго было дапрошана 14 сведак.

Лінейны пракурор тав. РЫЎКІН, у сваёй прамове зрабіў аналіз матэрыялаў судовага следства паказанняў сведак. Ён прыходзіць к вываду, што забойца тав. Чэпікава з'яўляецца ніхто іншы як Архіпаў. Ільін-жа — яго саўдзельнік. Гэта забойства, — кажа тав. РЫЎКІН, — не з'яўляецца простым крымінальным злачынствам. Гэта ёсць тэрарыстычны акт супроць аднаго з лепшых прадстаўнікоў рабочага класа, які вёў няўхільную барацьбу з подырамі, сімулянтамі і дэзарганізатарамі транспарта».

Суд прызнаў ІЛЬІНА вінаватым у падбухторванні да забойства Чэпікава і прыгаворан да 5 ГОД ПАЗБАЎЛЕННЯ СВАБОДЫ і, пасля адбыцця кары, высяленню ў далёкія краі. Непасрэдны забойца АРХІПАЎ прыгаворан да ВЫШЭЙШАЙ МЕРЫ СОЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ—расстрэлу.

Прыгавор пралетарскага суда сустрэў гарачае адабрэнне рабочых-чыгуначнікаў.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

ЭЛЕКТРАМАЛАЦЬБА

У мінулым годзе Саюзсельэлектра ўстанавіў у 34 калгасах БССР электрамалатарні. У бягучым годзе ўстанаўляецца 36 стацыянарных электраамалатарань, галоўным чынам у раёнах, прылягаючых да БелДРЭС. На электрыфікацыю малацьбы выдзелена 418 тыс. руб.

НОВЫЯ ХАРЧОВЫЯ КУЛЬТУРЫ

У гэтым годзе ўпершыню ў калгасах і саўгасах БССР будуць праводзіцца гаспадарчыя пасевы мексіканскага тамату на плошчы каля 30 гектараў і вопытныя пасевы землянічнага тамату.

Ураджай мексіканскага тамату кантрактуецца кандзітэрскімі і мармеладнымі фабрыкамі для перапрацоўкі на варэнне і начынку. З пладоў землянічнага тамату прыгатаўляецца кампот, кісялі і варэнне. Плады яго спажываюцца таксама і ў свежым відзе.

ВЕСНАВОЕ ПАЛЯВАННЕ

СНК БССР дазволіў да 10 мая веснавое паляванне на селязнёў, жураўлёў на пралёце, вальдшнэпаў на цязе і цецерукоў на таку.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

СЁННЯ ў 7 гадзін вечара, у памяшканні агульнай залы БелАН (рог Ленінскай і Універсітэцкай)

адбудзецца

ПАШЫРАНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ІНСТЫТУТА ПСІХА-НЕЎРАЛОГІІ БелАН.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб усесаюзнай гістолагічнай канферэнцыі (праф. Лебедзін дац. Голуб).
2. Даклад аб канферэнцыі па трафічнай інервацыі (дац. Пракапчук).
3. Даклад аб усесаюзнай канферэнцыі паталагаў (праф. Андрэеў).
4. Дэманстрацыя прэпаратаў па інервацыі наднырнікаў (дац. Голуб).

Запрашаюцца тэрапеўты, хірургі, фізіолагі, патофізіолагі і ўсе жадаючыя.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ АРГАНІЗАЦЫЙ, што Ўсебеларуская Кантора ДЗЯРЖБАНКА ПРАДАЕ наступныя ТАВАРЫ:

па неаплочаных і неакцэптаваных рахунках.

НАЛЕЖАЧЫЯ:

Ф-цы „ОКЦЯБР“	— Галаліт, шэвіот, трыко	№№ 2397, 2407	на 52.500 р.
БЕЛСОЎГАССНАБУ	— Трубы кр., факел 4 дм.	№№ 2398	„ 5.600 „
Базе БЕЛПРАМГАНДЛЯ	— Жакеты дамскія сук.	№ 2403	„ 6.435 „
БЕЛАПТЭКАКІРАЎНІЦТВА	—Вазілін ж. тэхн., ёд, калій, санітарыя, эстматол, экстракт сасн., боржвада	№№ 2405-06, 1920, 21, 23	„ 35.000 „
АБУТКОВАЙ фабрыцы	— Падашва муж. ял.	№ 2408	„ 28.000 „
БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАННЮ	— Міканіт тэрмаўлор	№ 2409	„ 3.630 „
З-ду „БОЛЬШЭВІК“	— Мездра ялов., хромік натраў	№№ 2410—11	„ 12.400 „
БЕЛСНАБЗБЫТУ	— Кругі нож.	№ 2412	„ 2.450 „
Базе філ. БАКТ'а	— Канц. тавары.	№ 2413	„ 9.370 „
Базе БАКТ'а	— Літаратура, біноклі	№ 2414—15	„ 2.300 „
Базе лабар. абстал.	— Розныя тавары	№ 2418	„ 2.200 „

Даведкі аб продажы з 12 гадз. 30 мін. да 13 гадз. 30 мін.

ДЗЯРЖБАНК.

Кіно «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад 25 красавіка мастацкі фільм вытворчасці Межрабпомфільм

АЭЛІТА

АНТА!.. АДЭЛІ!.. УТАЛ.)

Рэжысер—ПРАТАЗАНАЎ. У галоўных ролях: СОЛНЦАВА, БАТАЛОЎ, Ігар ІЛЬІНСКІ, І ЭГЕРТ. У праграме кіна-хроніка САЮЗКІНО.

Кіно-тэатр „Чырвоная зорка“.	Гукавы мастацкі фільм „ГРОЗА“ па твору Астроўскага
Кіно «Пралетарый»	Мастацкі фільм 2 БУЛЬДЗІ 2
Кіно „Спартак“.	2 праграмы ў 1 сеанс 1) Доктар Джэк кан. у 6 ч. 2) Труп Лэ-Юрэ кан. у 5 ч.
Дзіцячы кіно-тэатр	Маст. фільм у 3-х серыях ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯБАЛЯТА. У праграме—гукавая хроніка. Пачатак дзён. сеансаў у 3 г.

На падставе пастановы прэзідыума Менгорсовета ад 19-га сакавіка 1934 г. **пераймянованы** наступныя вуліцы і завулкі:

Венгерскі завулак —[illegible] зав.
Вялікая Татарская вул.—вул. Дзімітрава
Татарскі завулак —[illegible] зав.
Турэцкая вул. —Беламорская вул.
Турэцкі зав. —[illegible] зав.
Кітайская вул. —[illegible] вул.
Кітайскі зав. —[illegible] зав.
Яўрэйская вул. —[illegible] вул.
Зацюрэмны зав. —зав. [illegible]
Персідскі завул. —[illegible] зав.
Камароўская вул. —[illegible] вул.
Украінскі завулак —[illegible] зав.

МЕНГОРСОВЕТ.

Менск, друкарня «Звязды». Упаўн. Галоўліта № II—2599.